ВУГАЛЬ І ТРАНСПАРТ—вось два кіты, якія дадуць нам магчымасьць выканаць увесь народна-гаспадарчы плян

(Куйбышаў)

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 23 (3927)
НЯДЗЕЛЯ 25 СТУДЗЕНЯ
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Праграма перамагаючага сацыялізму

Адозва Савету Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэту УсесКП(б) ад 21-га студзеня аб кантрактацыі яравых пасеваў на 1931 г. азначае сабою і акрэсьлівае новы этап у разгорнутым наступленьні сацыялізму па ўсім фронце. Усьлед за прамысловасьцю, пры дапамозе якой партыя дасягнула канчатковай перамогі сацыялістычных форм гаспадаркі, трэці год пяцігодкі пазнае прыросьці да рашаючай перамогі ў галіне сельскай гаспадаркі, да абсалютнай перавагі сацыялістычных элементаў над індывідуальным сэктарам вёскі. Такім чынам, **на вясковым вучастку фронту ў трэцім годзе пяцігодкі павінна быць разгорнута рашаючае наступленьне**, якое і забясьпечыць канчатковую перамогу сацыялізму ў сельскай гаспадарцы і тым самым завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнае эканомікі нашай краіны. Адозва Савету Народных Камісараў і Цэнтральнага Камітэту партыі павінна расцэньвацца, як баявы загад, які расстанаўлівае сілы і размяркоўвае тэхнічныя сродкі, мабілізуе ўвагу, энэргію і ініцыятыву ўсіх арганізацый і шырачэзных рабоча-сялянскіх мас для рашаючага наступленьня на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Першай і зусім абавязковай умовай пасьпяховага выкананьня ўзятага баявога загаду зьяўляецца давядзеньне яго да кожнага радавога байца. Гэту ўмову трэба забясьпечыць пры правядзеньні ў жыцьцё адозвы СНК і ЦК.

Кожны пункт гэтае пастановы гучыць пераможным гімнам сацыялізму. 120 тыс. трактараў на працягу аднаго году (у пераводзе на 10-цісільныя трактары), 1.040 новых машынна-трактарных станцый. Падвоенае забесьпячэньне сельгаспадарчымі машынамі, 7 тыс. аўтамабіляў, каля 2 з пал. млн. тон мінеральных угнаеньняў, звыш 2 млн. тон гатункованага насеньня, 1.050.000.000 рублёў для калгасаў і МТС, 540 млн. рублёў на капітальнае будаўніцтва МТС і г. д.—вось тыя новыя, яшчэ небачаныя ўмовы нашае сельскае гаспадаркі, сродкі, якімі сацыялізм забясьпечвае многамільённую армію калгаснікаў, саўгасьнікаў і працоўнага селянства для канчатковай перамогі над кулаком.

Усе гэтыя лічбы павінен ведаць кожны рабочы саўгасу і МТС, кожны калгаснік, кожны бядняк і середняк! Кожны з іх павінен лішні раз упэўніцца, што **«ў гісторыі чалавецтва ўпершыню зьявілася ўлада саветаў, якая паказала на справе сваю гатоўнасьць і сваю здольнасьць давесьці працоўным масам селянства сыстэматычную і працяжную вытворчую дапамогу»**. (Сталін).

Кожны саўгасьнік, калгаснік, бядняк і середняк павінен ведаць, што такі вялізарны размах вытворчай дапамогі з боку пралетарскай дзяржавы стаў магчымым у рэзультаце няўхільнага і пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, у выніку палітыкі індустрыялізацыі, суцэльнае калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва, як класы. Гэта палітыка партыі перамагла ў выніку непрымірымай барацьбы, якую вяла партыя супроць простых агентаў кулака—правых апартуністаў, супроць «левых» авантурыстаў, супроць дэструктыўнікаў і прымірэнцаў.

Кожны саўгасьнік, калгаснік, бядняк і середняк павінен ведаць, што гэтыя лічбы—**итог толькі першых двух год пяцігодкі**, што далейшае разьвіцьцё нашай сацыялістычнай гаспадаркі пойдзе яшчэ больш паскораным тэмпам і што з году ў год вытворчая дапамога рабочай дзяржавы сацыялістычнай вёсцы будзе няўхільна ўзрастаць.

Нарэшце, кожны працоўны селянін павінен цьвёрда ведаць, што **гэту вытворчую дапамогу пралетарская дзяржава накіроўвае не на разьвіцьцё прыватна-гаспадарчага накапленьня, а «на справу калектывізацыі бядняцка-середняцкіх гаспадарак і ажыцьцяўленьня задачы ліквідацыі кулацтва, як класы»**.

Давядзеньне адозвы СНК і ЦК да самых шырокіх мас працоўнага селянства, актыўная папулярызацыя яе ў масах яшчэ искравей запаліць агні працоўнага энтузіязму, яшчэ больш акрыліць працоўную энэргію сьвядомасьцю блізкай і рашаючай перамогі, яшчэ мацней узброіць «знаменасцец» калектывізацыі і надасьць калгаснаму руху новы грандыёзны размах.

Побач з самай шырокай папулярызацыяй сярод мас пастановы СНК і ЦК, партыйных і савецкіх арганізацый павінны безадкладна **прыняць самыя энэргічныя меры, якія-б забясьпечвалі своечасовае і дакладнае правядзеньне ў жыцьцё гэтае адозвы**.

З асаблівай дакладнасьцю павінна быць ацэнена значэньне гэтага факту, з пункту гледжаньня пераходу пралетарскай дзяржавы да шырокага пляновага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Яшчэ нядаўна сельская гаспадарка ўяўляла сабою такую галіну нашае гаспадаркі, дзе прыватна-ўласьніцкая і рыначная стыхія стваралі вялізарныя труднасьці для ажыцьцяўленьня пляновых пачаткаў кіраўніцтва сельска-гаспадарчай вытворчасьцю і заготоўкамі сельска-гаспадарчай прадукцыі. Асаблівасьць сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы ў тым і заключаецца, што **ў сувязі з пераможным наступленьнем сацыялізму па ўсім фронце непамерна ўзрастаюць магчымасьці для пераключэньня с.-г. вытворчасьці на пляновыя сацыялістычныя рэйкі для больш шырокага пераходу да арганізаванага сацыялістычнага прадукта-звароту памін гарадам і вёскай**.

Уся адозва СНК і ЦК аб кантрактацыі яравых культур у 1931 г., як нельга красамоўней пацьвярджае гэту асаблівасьць сучаснага этапу сацыялістычнага наступленьня. Самай сур'ёзнай небясьпекай, якая можа сарваць ці затрымаць гэты пераход да планавага кіраўніцтва с.-г. вытворчасьцю і сацыялістычным прадуктаабменам, зьяўляецца правапартуністычная тэорыя «самацёку»: мой, усьлед за саўгасамі і калгасамі «сам сабой» зьявіцца і плян і «сам сабой» прадуктаабмен заменіць рыначную стыхію.

З гэтымі апартуністычнымі адносінамі да кантрактацыі трэба самым рашучым чынам змагацца. **Кантрактацыя на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва набывае новае, яшчэ большае значэньне, яна ўзьнімаецца на новую вышэйшую ступень, і сацыялістычны характэр гэтага мерапрыемства ў вялізарнай ступені ўзрастае.**

Давой глянуць на мерапрыемствы, паказаныя ў адозве СНК і ЦК у адносінах кантрактацыі базавых, буйных, ільняных і канаплянных пасеваў, каб як належыць ацаніць значэньне кантрактацыі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй сельскай гаспадаркі наогул і ў асобных раёнах, у прыватнасьці. Кантрактацыя прадугледжвае акрэсьлены **заказ** з боку дзяржавы капіталістам вытворнікам на вытворства вядомай колькасьці і якасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі, зьмяняе саму структуру пазаволства, выцісканочы нерэнтабельныя ў даных умовах культуры і, уводзячы новыя планы сацыялістычнай рэканструкцыі, укараняе новую тэхніку апрацоўкі зямлі і пасеваў і г. ц. Побач з гэтым, кантрактацыя прадугледжвае арганізаваную здачу с.г. прадукцыі дзяржаве ва ўстаноўленых тэрміны, на прадугледжаных даговорам умовах.

Нарэшце, **узрастае сацыяльна-палітычная роля кантрактацыі на даным этапе. Кантрактацыя зьяўляецца адным з магутнейшых сродкаў арганізацыйна-вытворчага ўмацаваньня калгасаў і ўздыму калгаснага руху.**

Ня прыходзіцца і гаварыць, якую арганізаваную сілу набываюць усе перапічаныя ў адозве СНК і ЦК укладаньні ў сельскую гаспадарку дзякуючы кантрактацыі, якая палае гэтым укладаньням пэўныя мэтавыя напрамкі па шляху калектывізацыі селянскіх гаспадарак.

Вось чаму, абвясьціўшы рашучую барацьбу апартуністычнай недавацэнцы кантрактацыі, партыйныя і савецкія арганізацыі павінны зараз-жа забясьпечыць самае дакладнае правядзеньне кантрактацыйнай кампаніі, як кампаніі масавай, у якой кожны калгаснік, бядняк і середняк усьвядоміў-бы абавязкі, якія ўскладаюцца ім на сябе і актыўна змагаўся-б за выкананьне і перавыкананьне гэтых абавязкаў.

«Уявіцца па-бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць свае сілы і растлумачыць масам рабочых і сялян значэньне правядзімых савецкай уладай мер па тэхнічных пераўзбраеньнях і калектывізацыі селянскай гаспадаркі, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудове вёскі—да гэтага заклікаюць і ўрад і ЦК партыі.

Агульным лозунгам павінна быць: **«Праграма пралетарскай дзяржавы будзе выканана і перавыканана».**

«(Правда»).

Баявы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва

Вялізарная праграма сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаная народна-гаспадарчым пляном трэцяга году пяцігодкі, прад'яўляе да транспарту рад сур'ёзьнейшых патрабаваньняў, ад выкананьня якіх у значнай ступені будзе залежыць ажыцьцяўленьне кантрольных заданьняў ва ўсіх галінах нашай работы.

Вялізарны рост прамысловай і сельска-гаспадарчай прадукцыі, павялічэньне разьмераў сырцовай базы, разьвіцьцё аб'ёму работ, зьвязаных з капітальным будаўніцтвам, нарэшце, моцнае ўзрастаньне ўсяе масы прадукцыі, якая мае зварот па ўсёй краіне — усё гэта ўсмладае на транспартную гаспадарку адказьнейшыя задачы, высоўвае ТРАНСПАРТ на становішча аднаго з рашаючых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Заданьні па транспарту, прадугледжаныя адзіным народна-гаспадарчым пляном на 1931 год, вельмі вялікія і надзвычай напружаныя. Грузазварот чыгуначнага транспарту павялічваецца ў бягучым годзе амаль на 100 млн. тон і дасягае 330 млн. тон. Сутачны прабег таварнага вагону павінен дасягнуць 135 кілёмэтраў, у той час, як на ўдарным квартале ён складаў толькі 90 кілёмэтраў. Штодзённая пагрузка павінна быць даведзена да 64 тыс. вагонаў супроць 46 тыс. у часе ўдарнага кварталу. Зьнімэньне сабекошту перавозак устаноўлена ў разьмеры 9 проц.

Паданыя прыкладаў даволі, каб зразумець усю складанасьць задач, якія паўстаюць перад транспартам у трэцім годзе пяцігодкі. Зусім відавочна, што ажыцьцяўленьне гэтых задач мысьліма толькі пры ўмове намаганьня ўсіх сіл партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, пры ўмове поўнай мабілізацыі творчага энтузіязму шырокіх мас транспартнага пралетарыяту на змаганьне за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на бязьлітасны руйнуючы адпор клясаваму ворагу, які імкнецца нанесьці ўдар па транспартнай гаспадарцы, як адной з важнейшых артэрый дзяржаўнага арганізму.

Сацыялістычны транспарт мае намала дасягненьняў на шляху свайго разьвіцьця. У многіх аблясьцях мерканьні пяцігодкі ім перавыкананы ўжо да цяперашняга часу.

АЛЕ ТРЭБА З УСЯЙ ЦЬВЁРДАСЬЦЮ І ЯСНАСЬЦЮ ПАДКРЭСЬЛІЦЬ, ШТО РАЗЬВІЦЬЦЁ ТРАНСПАРТУ ЯЎНА АДСТАЕ АД АГУЛЬНЫХ ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ, ШТО ТРАНСПАРТ НЕ СПРАЎЛЯЕЦЦА З ТЫМІ ПАТРАБАВАНЬНЯМІ, ЯКІЯ ДА ЯГО ПРАД'ЯЎЛЯЕ НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА.

Дзе хаваюцца прычыны такога становішча?

Часткова яны ляжаць у недахопах тэхнічнай базы транспарту. Шляхі зьнішчаньня гэтых недахопаў ідуць па лініі ўзмацненьня тэмпаў рэканструкцыі чыгуначнай гаспадаркі. Партыяй і ўрадам прыняты самыя рашучыя меры ў гэтым напрамку. Аб'ём капітальных укладаньняў у транспарт дасягае ў 1931 годзе вялізарнай лічбы — 3.185 млн. рублёў, супроць 1.800 млн. руб. у 1930 годзе. 3-й сэсіяй ЦВК СССР прапанавана СНК на працягу двух месяцаў зацьвердзіць генэральны плян рэканструкцыі чыгуначнага транспарту. Такім чынам, трэці год пяцігодкі будзе годам бурнага росту транспартнай гаспадаркі.

Але было-б зусім няправільным і палітычна шкодным бачыць корань усіх сур'ёзных недахопаў транспарту ў яго слабай тэхнічнай узброенасьці. Стаць на гэты пункт погляду — значыць проста скаціцца ў балота апартунізму, прыкрываць наяўныя балячкі «аб'ектыўнымі» прычынамі.

Праводзячы цьвёрды курс на рэканструкцыю транспарту, на далейшае яго тэхнічнае пераўзбраеньне, мы павінны з усёй рашучасьцю біцца за МАКСЫМАЛЬНАЕ СКАРЫСТАНЬНЕ НАЯЎНЫХ РЭСУРСАЎ, за карэннае паляпшэньне ЯКАСЬЦІ работы ўсіх звеньняў транспарту, абвясьціць вайну расхлябанасьці, бездакэнасьці — гэтаму бічу чыгуначных арганізацый.

І сапраўды, чым выпрумачыць, што цалкам рэальныя заданьні на ўдарны квартал транспартам БССР па асноўных паказальніках ня выкананы?

Прычыны гэтыя становяцца лёгка вытлумачальнымі ў супастаўленьні з тымі фактамі, якія гавораць іменна АБ НІЗКАЙ ЯКАСЬЦІ РАБОТЫ НА ТРАНСПАРЦЕ. Ударны квартал ня прынёс патрэбнага ўмацаваньня працоўнай дысцыпліны, напежнага росту ўдарніцтва, масавага разьвіцьця камуністычных мэтадаў працы, пералому ў зьберажэньні каштоўнейшага і важнейшага віду транспартнай гаспадаркі—паравознага парку.

У гэтым кварталі колькасьць здарэньняў на транспарце БССР узраспа да 351, супроць 269 у апошнім кварталі 1929-30 гасп. году. Процант хворых паравозаў значна перавышае нормы. Шматлікія выпадкі паўторнага рамонту паравозаў. Усё гэта ў сваю чаргу гаворыць аб тым, што многія партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі і органы адміністрацыйнага кіраўніцтва яшчэ далёка не перабудавалі сваёй работы прыстасоўна да запатрабаваньняў рэканструкцыйнага перыяду.

Такім чынам, асноўная задача транспарту — РАШУЧАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ, УМАЦАВАНЬНЕ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, РАЗГОРТВАНЬНЕ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, ЛІКВІДАЦЫЯ РЭШТАК ШКОДНІЦТВА.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны, нарэшце, шчыльна падысьці да задач палітычнага забясьпячэньня выкананьня трафінпляну, стаць у першыя рады байцоў за ажыцьцяўленьне вытворчых заданьняў. Трэба рашуча ўзяцца за перабудову форм і мэтадаў работы, перанесьці цэнтр увагі ў нізавыя первічныя звяны, прыстасаваць арганізацыйныя формы работы да вытворчых умоў рабочых мас, улічваючы ўсе асаблівасьці працы пасобных груп рабочых і служачых (разьезды і інш.).

Матар'ялы праверкі кіруючага складу партыйных і прафработнікаў сьведчаць аб буйнейшых недахопах у рабоце транспартных арганізацый. Апартуністычная практыка, элементы бюракратызму, закасьцянеласьці, слабае ажыцьцяўленьне прынцыпаў адзінаначальня, — усё гэта яшчэ ў значнай меры можна знайсьці ў транспартным апараце. Сыстэма кіраўніцтва чыгункамі павінна быць на чым-бы там ні стала палепшана, транспартны апарат павінен быць рашуча ўмацаваны людзьмі, здольнымі ажыцьцяўляць на практыцы генэральную лінію партыі, змагацца за ажыцьцяўленьне адказных задач, што стаяць перад транспартам.

Значэньне першачарговай важнасьці набывае для транспарту праблема кадраў, у прыватнасьці — кваліфікаванай рабочай сілы. На аснове пастановы ЦК УсеКП(б) аб звароце на чыгункі раней тут працаваўшых асоб, трэба дабіцца ў найкарацейшы тэрмін кансалідацыі транспартнага пралетарыяту, забясьпячэньня кваліфікаванай рабочай сілай усіх галін транспартнай гаспадаркі. Пастанова ЦК УсеКП(б) павінна быць неадкладна і выразна праведзена ў жыцьцё.

Нельга прайсьці міма адной з важнейшых задач, зьвязаных з умацаваньнем транспарту — паляпшэньня справы рабочага забясьпячэньня. Павялічэньне намінальнай заработнай платы на 10 проц., прадугледжанае кантрольнымі лічбамі 1931 году, павінна ісьці адначасова з няўхільным пашырэньнем забясьпячальнай базы, з пасьлядоўным ажыцьцяўленьнем прынцыпаў клясавага забясьпячэньня, з пешай арганізацыяй разьмеркаваньня, з удасканаленьнем работы закрытых разьмеркавальніка, грамадзкага харчаваньня і г. д.

Баявой вытворчай задачай сёньняшняга дня паўстае пытаньне аб зьберажэньні паравознага саставу — гэтай асновы чыгуначнай гаспадаркі, гэтага важнейшага фактару выкананьня транспартам усіх сваіх вытворчых праграм. Барбарскія адносіны да паравозаў, нізкая якасьць рамонту, што вядуць да выбыцьця са строю каштоўнейшай маемасьці — павінны выпальвацца налёным жалезам, расцэньвацца як злачынства перад пралетарскай дзяржавай.

Задачы транспарту вялікія і адказныя. Яны павінны прыняць да сябе ўвагу ўсёй нашай партыі. Справа транспарту ёсьць справа ня толькі чыгуначных арганізацый. Мясцовыя партарганізацыі і камітэты павінны бліжэй падысьці да пытаньняў работы транспарту, дапамагчы чыгуначным партыйным арганізацыям вырашыць задачы, якія перад імі стаяць.

Рашуча змагаючыся з усякімі скажэньнямі лініі партыі, з пралупеньнямі апартуністычнай практыкі, узьнімаючы бяздольнасьць чыгуначных партыйных арганізацый, вчышчаючы транспарт ад усяго клясава-варожага, бюракратычнага, зьнішчаючы вынікі шкодніцтва, мабілізуючы масы на змаганьне за выкананьне бягучых вытворчых задач, на аснове далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, умацаваньня працоўнай дысцыпліны — мы забясьпечым рашучы пералом на транспарце, даб'емся поўнага ажыцьцяўленьня заданьняў, якія прад'яўляюцца транспарту ўсё больш узрастаючымі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЮ

ВЭРЛІН, 21. Сёньняшні нумар «Роте Фанэ» прысьвечаны памяці Леніна. Асноўны лозунг «першай старонкі» «Наш фронт наступае пад пёзунгамі Леніна». У перадавіцы аб Леніне, між іншым, гаворыцца:

«160 млн. працоўных у вызваленай савецкай краіне абвяшчаюць пераможны паход ленінізму. Ленінізм — гэта тэорыя і практыка рэвалюцыйнага марксызму ў эпоху імпэрыялізму і барацьбы за сусьветную дыктатуру пралетарыяту. Ленінізм у сучасны момант ня толькі правяраецца ў агні клясавых баёў ва ўсіх краінах капіталістычнай эксплёатацыі, ня толькі арганізуе белыя армії малодой упэўненай у перамозе рабочай клясы, якая выступае супроць старой затнівалчай капіталістычнай сыстэмы, але разам з тым будуе на адной шостай зямной кулі непрыступную крэпасьць сусьветнага сацыялізму».

«Няма ніводнай часткі сьвету, — піша далей газэта, — якую-б не трасла грозная адзань камунізму. У сёмую гадавіну сьмерці Леніна наш баявы заклік: **«Ленін памёр, але яго партыя і ленінізм — жывуць! Наш фронт наступае пад вызваленчымі пёзунгамі ленінізму! Ён эьнішчыць ярмо капіталізму і панцуті міжнароднага рабства —плян Юнга. Ён непарыўна зьвязан з крайнай сацыялізму — Савецкім Саюзам. Наш фронт — фронт будучай свабоднай сацыялістычнай савецкай Нямеччыны, якая зьявіцца пад пераможным сьцягам Леніна новым этапам у барацьбе за сусьветны камунізм».**

У газэце зьмешчаны лісты рабкораў аб Леніне. У дадатку да газэты дан артыкул тав. Сталіна «Аб гістарычных карэньнях ленінізму» і артыкул тав. Вілі Мюнцэнберга «Ленін і рэвалюцыйная моладзь».

Жудаснымі катаваньнямі і крывавымі карнымі экспэдыцыямі польскаму фашызму не задушыць рэвалюцыйнага руху працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі

КАТАВАНЬНІ, ЯКІХ НЯ ВЕДАЕ ЧАЛАВЕЦТВА

Сусьветны эканамічны крызіс, які ахапіў усе капіталістычныя краіны, асабліва моцна ўдарыў па фашысцкай Польшчы, гэтым найбольш слабым зьвяне ў сыстэме міжнароднага імпэрыялізму. Масава закрываюцца фабрыкі і заводы. Шалёнымі тэмпамі расьце беспрацоўе. На жаданьне сотэнь тысяч беспрацоўных працы — **фашысцкі ўрад адказвае нулямі і гумовымі палкамі.**

Каб адвесьці гаспадарчы развал і палітычны крызіс, польскі фашызм бачыць адзіны ратунак ва ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР — бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту, а таксама ў вынішчэньні рэвалюцыйна-вызваленчага руху на Зах. Украіне і Зах. Беларусі.

Крывавыя расправы над украінскімі і беларускімі працоўнымі масамі, сыстэма жудасных, нябачаных катаваньняў палітзьняволеных у дэфэзывах і турмах — усё гэта ярка сьведчыць аб піхаманкавай падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі фашысцкай Польшчы.

Мы, рабочыя і служачыя Менхладабойні, рашуча пратэстуем супроць крывавага тэрору, які праводзяць фашысцкія каты ў адносінах да рэвалюцыйных рабочых і сялян Зах. Украіны і Зах. Беларусі; мы пратэстуем супроць зьверскага прысуду над б. дэпутатамі Беларускага Рабоча-Сялянскага пасольскага клюбу «Змаганьне».

У адказ фашысцкім катам мы, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, яшчэ больш умацуем тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва на выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Калектыў рабочых уносіць аднадзенны заработак на дапамогу палітзьняволеным — гэтым барацьбітом за сусьветны Кастрычнік.

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных Зах. Украіны, Зах. Беларусі і Польшчы!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

АЗЬВЯРЭЛАЯ ПАЛІЦЭЙШЧЫНА У МЭТАДАХ КАТАВАНЬНЯ НЯ МАЕ САБЕ РОУНЫХ

Магілеўскі агульна-гарадзкі мопраўскі актыў з абурэньнем пратэстуе супроць махлівага катаржнага прысуду над б. дэпутатамі Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу «Змаганьне» і над крывавым тэрорам разьюшанай польскай паліцэйшчыны ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі.

Шляхам нячуванага тэрору польскі фашызм імкнецца прыдушыць рэвалюцыйны рух у Зах. Украіне і Зах. Беларусі і тым самым падрыхтаваць сабе плацдарм і тылы ў будучай вайне з СССР.

У адказ на крывавы тэрор фашысцкіх інквізытараў мы яшчэ мацней згуртуем свае рады вакол камуністычнае партыі для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Мопраўскі актыў у адказ фашысцкім інквізытарам абяцае максімальна ўзмацніць мопраўскую работу, шырока разгарнуць інтэрнацыянальнае выхаваньне, увязваючы яго з сацбудаўніцтвам.

Сьмерць фашысцкім катам!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве ленінская камуністычная партыя ва ўсім сьвеце!

Узнагарода ЎсеЛКСМ ордэнам працоўнага сьцягу

За праяўленую ініцыятыву ў справе ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва, што забясьпечвае пасьпяховае выкананьне пяцігадовага плану разьвіцьця народнай гаспадаркі Саюзу ССР, прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР пастанаўляе:

УЗНАГАРОДЗІЦЬ УСЕСАЮЗНЫ ЛЕНІНСКІ КАМУНІСТЫЧНЫ САЮЗ МОЛАДЗІ ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ.

Сакратар СНК Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Папраўка

У перадавым артыкуле «Зьвязды» № 22 ад 24-га студзеня ў першай калёнцы, чацьвертым абзацы зьнізу на тэхнічным недагляде ўкрался прыкрая памылка, якая супярэчыць як усёй устаноўцы артыкулу, так і заключнай фармулёўцы па пытаньнях барацьбы з ухілам ад генэральнай лініі ў нацпалітыцы партыі і з шавінізмамі.

Пачатак гэтага абзацу трэба чытаць:

— Гэтых посьпехаў КП(б)Б дабіваецца ў непрымірымым змаганьні супроць **вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе**, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-домаскраўскага і правінізма ў розных колерах.

Даб'емся пералому на транспарце

(З дакладу тав. Гантмана на бюро ЦК КП(б)Б аб выніках транспартнай нарады пры ЦК УсеКП(б) і бліжэйшых задачах на транспарце)

Я ня буду на бюро ЦК многа гаварыць аб вялізарным значэньні чыгуначнага транспарту для ўсяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба толькі падкрэсьліць асаблівае значэньне, якое чыгуначны транспарт, апрача яго ролі і месца ў сацыялістычным будаўніцтве, мае ва ўмовах БССР, як рэспублікі, якая мяжуе з капіталістычным Захадам. Апэнка, якая дана пастылай становішчу чыгуначнага транспарту на сёньняшні дзень, і ў прыватнасьці апэнка, даная пленумам ЦК УсеКП(б) і ЦКК аб тым, што транспарт пагражае стаць «вузкім» месцам нашага сацыялістычнага будаўніцтва, цалкам датычыць і чыгуначнага транспарту на Беларусі. Праверка кіруючых партыйных і прафэсыянальных кадраў на транспарце, праведзеная пад пунктам выдуленьня ня толькі эдольнасьці гэтых кадраў справіцца з задачамі, што стаяць перад намі, але і высьвятленьня становішча на транспарце наогул і асноўных прычын, якія тармозяць правядзеньне раду мерапрыемстваў, вынаходзных на замацаваньні транспарту, — выкрыла цэлы рад вялізных недахопаў, без рашучага перамаганьня якіх ня ўдасца ўзмацніць транспарт і прывесьці тэмпы яго разьвіцьця ў поўную адпаведнасьць з агульнымі тэмпамі нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ударны квартал на транспарце ня даў неабходнага пералому. Даныя, якія ёсьць на асноўных чыгуначных вузлох БССР, кажуць аб тым, што мы ня толькі не атрымалі палепшэньня па ўсіх асноўных паказальніках і плянавых заданьнях, але на радзе паказальнікаў маем нават далейшае пагоршаньне ў параўнаньні з апошнім кварталам мінулага гаспадарчага году. У гэтых адносінах трэба асабліва адзначыць становішча Аршанскага і Жлобінскага чыгун. раёнаў. Вось некаторыя галоўнейшыя паказальнікі, якія характарызуюць працу асноўных чыгуначных вузлоў:

Як бачыце, пералому ў рабоце транспарту няма, асноўныя дырэктывы аб працы транспарту і задачах у сувязі з асенньня-зімовымі перавозкамі (якія даны ЦК УсеКП(б) 10 верасьня) ня выкананы або выконваюцца зусім слаба. Перабої, якія мы мелі ў пэрыяд узмоцненых загатовак і перавозак сельска-гаспадарчых тавараў, перабоі, якія мы маем сёньня ў сувязі з разгортваньнем лесазагатоўчай кампаніі, ня гледзячы на тое, што чыгуначны транспарт БССР далёка не нагружан, гаворыць аб тым, што трэба безадкладна мабілізаваць партыйныя арганізацыі і рабочых транспартнікаў на ліквідацыю тых прарываў і буйных недахопаў, якія ёсьць на транспарце.

Транспартная нарада, праведзеная пад дырэктывы ЦК УсеКП(б), якой была аддана асаблівая ўвага і ў працы якое прыняў удзел амаль што ўвесь склад Палітбюро ЦК УсеКП(б), дала адказ на ўсе самыя балючыя пытаньні ў працы транспарту і паставіла перад транспартам і партыйнымі арганізацыямі рад канкрэтных задач. На транспартнай нарадзе пры ЦК УсеКП(б) у цэнтры ўвагі стаяла пытаньне аб становішчы паравознага і вагоннага парку. Паводле афіцыяльнай статыстыкі процант паспаваных паравозаў складае прыкладна 15-17 проц., сапраўды-ж гэты процант значна вышэйшы, бо некаторыя паравозы, якія знаходзяцца ў эксплёатацыі, таксама не зьяўляюцца спраўнымі. Абезасобленая нада на паравозах, праведзеная амаль усюды яшчэ год таму назад, побач з некаторымі дадатнымі бакамі, якія заключаюцца ў большай нагрузцы паравозаў і больш правільным выкарыстаньні паравознага парку, — дала таксама і рад адмоўных вынікаў, асноўным з якіх зьяўляецца зьнішэньне адказнасьці з боку паравозных брыгад за стан паравозаў. Я сам, будучы ў дэпо ў Воршы і іншых месцох, пазіраў, як машыністы, прымацаваныя да паравозаў, праяўляюць зацікаўленасьць да рамонту, якасьці рамонту, асабіста прымаюць ўдзел і даюць указаньні, спрачаюцца з рабочымі рамонту, дабіваючыся таго, каб рамонт паравоза быў зроблен як можна лепш. Машыністаў-жа з безасобленых паравозаў я ў дэпо не сустракаў: яны ня цікавяцца якасьцю рамонту.

Таму транспартная нарада прыйшла патрэбным, побач з абезасобленай яздой, шырока практыкаваць сыстэму парнай і трайной язды. Зразумела, гэтае пытаньне патрабуе дэтальнай апрацаўкі, бо ў некаторых выпадках пераход да сыстэмы парнай і трайной язды можа сустрэцца з неабходнасьцю перагледзець лаўжыню плеча ў бок яго скарачэньня. Аднак, гэта не зьяўляецца непераможнай перашкодай.

Сыстэма аплаты паравозьнікаў таксама не стымулюе зацікаўленасьці з боку паравозных брыгад у сэнсе захаваньня паравозаў. Таму на падставе пастановы нарады і дырэктывы ЦК УсеКП(б) пераглядзецца сыстэма заработнай платы на транспарце, якая стаіць у залежнасьці ня толькі ад накілёметраных, але і ад таго, як тая ці іншая брыгада забясьпечыць захаваньне самога паравозу.

За апошні пэрыяд часу склад машыністаў і іх памочнікаў значна амаладзеў. Гэта зусім нармальнае і заканомернае зьявішча, але разам з гэтым на стане паравознага парку адбілася некаторае зьніжэньне кваліфікацыі, з прычыны таго, што цэлы рад старых кваліфікаваных машыністаў пераведзен з транспарту на ўсякія іншыя працы. Таму пастанова транспартнай нарады адносна звароту на транспарт машыністаў, іх памочнікаў, а таксама кваліфікаваных рамотных рабочых, якія пайшлі з транспарту на іншыя работы, — зьяўляецца своечасовай і правільнай. ЦК КП(б)Б абавязан забясьпечыць строгае правядзеньне ў жыцьцё гэтай дырэктывы ЦК УсеКП(б), не дапускаючы адступленьняў.

Наступнае хваравітае пытаньне ў працы транспарту — гэта сыстэма гаспадарчага кіраўніцтва. Трэба сказаць, што пераход на раённую сыстэму сябе апраўдаў. Ня маюць рацыі пасабныя таварныя, якія ўсё зло на транспарце бачаць у стварэньні раёнаў. Стварэньне раёнаў было патрэбным і наблізіла гаспадарчае кіраўніцтва непасрэдна да вытворчасьці і да мас. Але ў працэсе правядзеньня гэтай рэарганізацыі быў дапушчан рад буйнейшых недахопаў. Так, напр., пры раёнах створана 19 пасобных груп, якія праводзілі сваю працу паралельна без узгадненьня: ня было выразнага разьмежаваньня функцый паміж групамі; кожная група давала свае дырэктывы і цыркуляры, і гэты паперовы паток наваліўся адразу на начальнікаў станцый, чые функцыі значна папырыліся ў параўнаньні з ранейшымі. Таму нарада прызнала неабходным безадкладна ліквідаваць гэтыя групы, стварыць сетку асноўных аддзелаў, з выразным разьмежаваньнем функцый паміж пасобнымі аддзеламі. Практыка таксама паказала, што канцэнтрацыя ў руках начальнікаў станцый усіх функцый стварала труднасьці, бо гэтыя начальнікі станцый ня былі ў стане ахапіць усё. Таму пастанова нарады адносна выдзяленьня дэпо асноўных і зваротных у самастойныя гаспадарчыя адзінкі таксама зьяўляецца надавычай неабходнай і абсалютна правільнай.

Структура дырэкцый, а таксама самога НКПС прыводзіцца ў поўную адпаведнасьць са структурай раёнаў. Такім чынам мы зьверху, пачынаючы ад НКПС і да раёнаў будзем мець адпаведную арганізацыйную структуру і больш выразнае кіраўніцтва.

Буйнейшым недахопам у працы транспарту зьяўляецца таксама адсутнасьць строгай плянавасьці ў перавозках як з боку транспарту, так і з боку кліентуры. Трэба адзначыць, што з боку машыністычнай практыка, самацёк, зусім не дастатковая праца па мабілізацыі мас на барацьбу з недахопамі ў працы транспарту. Самакрытыка разгорнута вусіх недастатковая.

Нарада пры ЦК УсеКП(б) прыняла рад пастаноў, накіраваных да безадкладнай перабудовы партыйнай і прафэсыянай працы, узмацненьня кіруючых прафэсыянальных і партыйных кадраў, больш выразнай арганізацыйнай пабудовы партыйных арганізацый на транспарце. Між іншым, прынята пастанова адносна выдзяленьня партыйных сакратароў, арганізатараў пры эксплёатацыйных раёнах, і на іх укладаецца кіраўніцтва ячэйкамі і станцыйнымі камітэтамі на транспарце; яны будуць непасрэдна падначалены абкомам і ЦК нацрэ

Партработу на транспарце перабудаваць у адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі

У цэх, зьмену, брыгаду—цэнтр цяжару партработы

Прыступіць да перабудовы

Разгорнутае будаўніцтва сацыялізму, шпаркі рост народнае гаспадаркі ставіць перад транспартам вялізарныя задачы. Між тым асобны квартал з усёй выразнасьцю падкрэсьліў, што транспарт працуе далёка нездавальняюча. Асноўныя вымернікі, транфіплян радам важнейшых вузлоў БССР сыстэматычна з кварталу ў квартал не выконваюцца. Ва ўдарным квартале ўзрасьлі прагулы, пагоршылася якасьць рамонту, узрасьлі здарэньні. Такое становішча на транспарце з усёй выразнасьцю гаворыць за тое, што транспартныя парторганізацыі далёка не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, якія паставіла партыя перад транспартам, выходзячы з яго асаблівасьцяй, не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

Партыйныя транспартныя арганізацыі не перанесьлі цяжару сваёй работы ў цэх, зьмену, брыгаду, не прасяклі ўсе работы элементамі праверкі выкананьня, не забясьпечылі сапраўднага канкрэтнага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. Яны яшчэ не зрабілі спаборніцтва і ўдарніцтва асноўнай умовай змаганьня за высокія тэмпы работы на транспарце, за выкананьне вымернікаў і транфіпляну. Парт'ячэйкі і станцыйныя камітэты не аддалі адпаведнай увагі пытаньням уліку эфэктыўнасьці ўдарніцтва, не заўсёды дапамагалі і падтрымоўвалі добрыя пачынаньні ўдарнікаў, часамі заставаліся ў баку, замест таго, каб арганізаваць актыўнасьць рабочых на ліквідацыю прарываў у рабоце транспарту.

Няўменьне стаць на чале актыўнасьці рабочых, апартуністычная недавацэнка шматлікіх форм сацспаборніцтва—усё гэта прыводзіла да паглыбленьня прарываў на радзе чыгуначных вузлоў.

На транспарце, як і на другіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, няма нікіх «аб'ектыўных прычын», якімі можна было-б прыкрыць адставаньне гэтага галоўнейшага вучастку ў тэмпах работы.

«Аб'ектыўнымі прычынамі» могуць прыпрыхацца толькі людзі, нездольныя ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, толькі тыя, хто замест падтрыманьня рабочай ініцыятывы, груба не ігнорыце, ужываючы тэмпы работы, якія не адпавядаюць задачам рэканструкцыйнага порыву. Сьцьвярджэньні аб немагчымасьці ўжываньня на чыгунцы такіх тэмпаў, як на іншых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, з-за якіх «аб'ектыўных прычын» разьбіты жлобінцамі. Жлобінцы паказалі, што ніякіх аб'ектыўных прычын ня існуе там, дзе ёсьць сапраўдная гарачная адданая барацьба прапітараў за шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Жлобінцы праз вытворчыя манэўры на 50 проц. зьменшылі колькасьць хворых паравозаў, давялі, што можна вызьлі з практыкі паўторны рамонт паравозаў праз высокую якасьць работы, праз уважлівыя адносіны да сваіх абавязкаў.

На транспарце яшчэ месцамі застаецца рэшткі кансэрватызму, непаваротлівасьці, кар'ерызму і павольнасьці ў рабоце. Гэтым «прыгожасьцям» павінна быць абвешчана самая жорсткая бязьлітасная барацьба.

Партыйныя і прафэсыянальныя транспартныя арганізацыі ў сваім змаганьні за выкананьне транфіпляну павінны выкарыстаць вопыт ленінградзкіх чыгуначнікаў аб паскарэньні ўсіх відаў рамонту.

Праз мабілізацыю ўсіх рабочых-чыгуначнікаў, праз бязьлітаснае змаганьне з пасіўнасьцю ў рабоце патрэбна на чым-бы там ні стала дасягнуць паляпшэньня якасьці рамонту паравозаў.

Камуністы-транспартнікі павінны стаць на чале змаганьня за сапраўды бальшавіцкія ўдарныя тэмпы работы, за баявое выкананьне вытворчых задач, за ажыцьцяўленьне сыстэматычнага кантролю ў пытаньнях нарэшце рэканструкцыі транспарту і мабілізацыі яго ўнутраных рэсурсаў.

Партыйная работа павінна быць перабудавана так, каб цэнтр яе цяжкасьці быў перанесен у цэх, зьмену, брыгаду, у цягніковыя кандуктарскія брыгады. Наладзіць сыстэматычную работу з паравозьнікамі, машыністамі, рабочымі рамонтных паркаў—першачарговая задача кожнай транспартнай ячэйкі.

На транспарт павінны быць перанесены лепшыя ўзоры работы прамысловасьці, да работы транспарту павінна быць прыцягнута ўвага шырокай партыйнай і пралетарскай грамадзкасьці.

На вышыню палітычных задач—партработу на чыгунцы

Партыя на працягу ўсяго перыяду надзвычай вялікую ўвагу аддавала рабоце транспартных партарганізацый, давала рад дырэктыў і ўказаньняў аб перабудове іх работы. Аднак, на сёньняшні дзень мы павінны канстатаваць, што партарганізацыі транспарту яшчэ не перакліталіся на выкананьне гэтых дырэктыў, на балявы тэмпы работы. У пачатку студзеня месяца ары ЦК КП(б)Б была складзена спэцыяльная камісія на праверцы, наколькі партыйныя арганізацыі асноўных чыгуначных вузлоў БССР выконваюць дырэктывы партыі. Праверкай выяўлена, што пералому ў радзе партыйных чыгуначных арганізацый яшчэ няма.

Напрыклад, на Менскім чыгуначным вузле, аб партарганізацыі якога «Зьвязда» некалькі часу таму назад пісала, няма тых тэмпаў работы, якія-б адпавядалі задачам рэканструкцыйнага порыву. Работа партарганізацыі вузла яшчэ не перабудавана. Партыйная арганізацыя ня стала ў поўным сэнсе слова на чале ўзросшай актыўнасьці рабочых мас.

На Гомельскім вузле замест таго, каб узмацніць партыйную работу і кіраўніцтва прафэсыянальнай арганізацыі, на ударным квартале тэмп там яўнае аслабленьне работы на радзе вучастку. Аб гэтым выразна сьведчаць тыя паказальнікі, якія мы мелі ва ўдарным квартале. Ня толькі рабочыя, а нават і партыйныя масы поўнасьцю ня ўдзігнуты ў сацспаборніцтва і не заўсёды ідуць прыклад ударных тэмпаў работы. Так, на 9-м вучастку члены партыі ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам толькі на 44 проц. Іншыя партыйцы ня прымаюць удзелу ў рабоце ўдарных брыгад. Разам з гэтым парторганізацыя вяла слабае змаганьне з ліжаўдарніцтвам, ня ўзьнімала сацыялістычнага спаборніцтва на вышэйшую ступень. На ініцыятыве саміх рабочых было арганізавана 7 «сквозных» ударных брыгад, але ў сувязі з тым, што яны ня сустрэлі адпаведнага падтрыманьня, кіраўніцтва дамагог, гэта пачынаньне далей сваіх ідэй ня выйшла.

Нізкая парт'ячэйкі пытаньнямі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва не займоцца. Прафарганізацыі не аддаюць ніякай увагі абмеркаваньню такіх пытаньняў, як павышэньне працоўнай дысцыпліны, якасьць работы і інш. Меры грамадзкай уздзейнасьці ў адносінах тых, хто робіць прагулы, самавольне пакідае работу і г. д., ня ўжываюцца. Нельга не сказаць і на тое, што і пасобныя камуністы замест таго, каб змагацца за высокую працоўную дысцыпліну, часта падтрымоўваць яе. Выпадак, калі старшыня мясцкому № 4 зьявіўся на работу п'яным і гонтым пяць дзён ня выходзіў на работу,

Прапановы рабочых выконваюцца дрэнна. За апошні час з 387 прапаноў выкананы толькі 150. Але і аб выкананьні гэтых прапаноў шырокія рабочыя масы не інфармуюцца. Дрэнна справа стаіць і з прэміраваньнем рабочых за вынаходзтва. Прэміравана 11 рабочых на суму 545 руб. у той час, як вынаходзтва дало прыбытку каля паўтары тысячы рублёў.

На Віцебскім вузле за апошні перыяд назіраецца яўны пералом у рабоце. Аднак, гэты пералом не замацаваны на радзе вучасткаў работ. Слаба яшчэ партыйныя ячэйкі накіроўваюць актыўнасьць рабочых мас на разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Ні райпарткалектыў, ні райпрафсаюз ні нават нізавыя парт'ячэйкі і мясцкомы ня ведаюць сваіх лепшых ударнікаў. Яўзгіка КП(б)Б паравозьнікаў абслугоўвае 130 рабочых, а ўдарніцтвам ахоплена толькі 29 чал. Працоўная дысцыпліна слабая. Нават камуністы часта парушаюць працоўную дысцыпліну.

Нельга не сказаць і на тое, што Віцебскі гарком да гэтага часу слаба кіраваў работай партыйнай арганізацыі вузла, слаба мабілізаваў масы на выкананьне з праваапартуністычнай практыкай у рабоце партарганізацыі вузла. Нарада, якая адбылася пры гаркоме, канстатавала рад вялікіх недахопаў у рабоце парт'ячэек вузла. Аднак, яна не дала палітычнай ацэнкі гэтым фактам.

На лепшае становішча з партработай і на Полацкім чыгуначным вузле. Там у выніку слабага разгортваньня партыйнай работы і мабілізацыі мас вакол асноўных палітычных задач, што паставілены перад транспартам, мы маем слабае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва дрэнную працоўную дысцыпліну і рад іншых недахопаў.

На Полацкім вузле прамыўка паравозаў адбываецца на працягу 6 гадзін. У той час, калі сярэдні прабег паравозаў у суткі павінен раўняцца 199 клм., ён зараз раўняецца толькі 157 клм. Ад прамыўкі паравозаў адбываецца с. сыстэматычным спазьненьнем. Псаваньне вагонаў за кастрычнік месяц дасягала 10. Наладзілася частыя адпраўкі таварах не па прызначэньні.

Парторганізацыя вузла часамі не разавала на ўсе гэтыя чынны.

Вышэйпаданы факт гаворыць за тое, што партыйныя арганізацыі на транспарце павінны арабіць у самы недакладны тэрмін карэнны паваро да тых палітычных задач, якія паставіла партыя перад транспартам. Праз ко- рабоцу парт'ячэйкі і больш шырокую мабілізацыю рабочых мас за ход гэтых задач партарганізацыі дабіцца ажыцьцяўленьня тэй праграмы, якая паставілена перад транспартам на трэці год пяцігодкі.

Цедрэнка.

Не пастановамі, а практычнай работай дабівацца ўзорнай, выразнай дзейнасьці вузла

На Жлобінскім вузле асобны квартал ня даў паленшаньня ў справе выкананьня прамфінпляну і асноўных вымяральнікаў. Калі камэрцыйная хутказьць (рух таварнага цягніка ў гадзіну) у верасьні дасягала 18,58 клм., у кастрычніку — 16,54 клм., дык яна ў лістападзе зьнізілася да 13,30 клм. Процант няспраўных паравозаў у асобным квартале павялічыўся ў параўнаньні з апошнім квартałам 1929-30 г. замест рашучага зьніжэньня. Вязумоўна, адным з характэрных паказальнікаў работы транспарту трэба лічыць рух цягнікоў па раскладзе. Калі ў верасьні па раскладзе было адпраўлена ўсіх цягнікоў 63,4 проц., у кастрычніку 64,34 проц., дык у лістападзе процант адпраўленых цягнікоў па раскладзе зьнізіўся да 46,98.

Гэтыя лічбы з усёй выразнасьцю гаворыць за тое, што Жлобінскі вузел горш працаваў у асобным квартале, чым у апошнім квартале мінулага году.

Асноўнымі прычынамі вялізарных грэхаў у рабоце вузла трэба бязумоўна лічыць тое, што **абноўленае кіраўніцтва, як і мінулае апартуністычнае, якое ў свой час было зьнята, не аперлася ў сваёй рабоце на актыўнасьць і творчы энтузіязм рабочых, не аддало патрэбнай увагі пытаньням разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.**

Станцыйны парткамітэт, прымаючы па сутнасьці добрыя пастановы мала або зусім не правяраў, як партыйныя ячэйкі выконваюць гэтыя пастановы, як перабудоўваюць сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі і асаблівасьцямі работы на транспарце. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў выніку адсутнасьці належнага кіраўніцтва ўвесь час зьніжалася з кварталу ў квартал. Калі ў лічні сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам было ахоплена 69 проц. усіх рабочых, то ў кастрычніку процант ахопу рабочых зьнізіўся да 58. У асобным квартале зусім адсутнічае ўлік брыгад, якія спаборнічаюць паміж сабой, адсутнічае ўлік эфэктыўнасьці ўдарніцтва.

У асобным квартале катастрафічна вырасьлі здарэньні, зьнізілася працоўная дысцыпліна. Калі ў чацьвертым квартале мінулага году былі 143 выпадкі здарэньняў, дык у асобным квартале лік здарэньняў вырас да 516.

Партыйны камітэт і цэхавыя ячэйкі не мабілізавалі ўвагі ўсіх рабочых чыгуначнікаў на пытаньнях барацьбы з прагуламі, з косным адносінам да работы на вытворчасьці, несыстарчальна і невыразна змагаліся за прыпадпасьць камуністаў і камсамольцаў на вытворчасьці. Гэта пацьвярджаецца хоць-бы тым, што на асобных МК сацспаборніцтвам ахоплена толькі 30-35 проц. членаў і кандыдатаў партыі. Асноўная бяда ў тым, што значная частка камуністаў і камсамольцаў ня ўлічвае важнасьці сьвай работы на транспарце, ня ўлічвае, што ліквідаваць прарыў на вузле можна толькі агульным, памагнымі, толькі праз самадзейную творчую работу рабочага калектыву, у першых радох якога, бязумоўна, павінны быць члены і кандыдаты партыі. Партком і цэх'ячэйкі ў належнай меры не патрабавалі ад членаў партыі ажыцьцяўлення ўлікі ім ударных вымагах сацспаборніцтва, за выкананьне вытворчых заданьняў.

На Жлобінскім, як і на радзе іншых вузлоў, **партарганізацыя ўсё яшчэ не перайшла ад агульных разважаньняў** да канкрэтнай работы, да праверкі выкананьня. Асноўныя мэтады і формы работы ўсё яшчэ ня поўнасьцю адпавядаюць задачам, якія паставіла партыя перад транспартам.

На вузле працуе ўдарная брыгада рабочых з Канатоўцу, якая паказвае ўзоры сапраўднай бальшавіцкай работы, якая мае вялізарныя посьпехі па выкананьні і перавыкананьні транфіпляну. Замест таго, каб вопыт яе змаганьня за транфіплян перакінуць на найбольш адсталыя вучасткі вузла, — вакол брыгады стварэцца нездаровая атмасфэра. Канатоўцаў - ударнікаў пачынаюць цкаваць з тае прычыны, што яны украінцы. Вялікадзяржаўныя шавіністы і беларускія нацыянал - дэмакраты цкуюць ударнікаў, якія на вузел прынесьлі ударныя тэмпы работы, дакладнае выкананьне сваіх абавязкаў, гераічную адданасьць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Прычыны невыкананьня транфіпляну стануць зусім яснымі і зразумелымі, калі ўлічыць, што адносіны адміністрацыі да прапаноў рабочых і вынаходзтваў зьяўляюцца нецярпіма бюракратычнымі, чыноўніцкімі. Сто рабочых прапаноў, якія яшчэ ў 1928 г. былі адданы адміністрацыі на кансультацыю, кансультуюцца і да сёньняшняга дня. Вынаходзтвы рабочых па некалькі месяцаў марнуюцца ў бюро «Дорпузла» Зах. чыгункі.

Прыведзеныя факты яшчэ раз падкрэсьліваюць, што **партарганізацыя, падтрымліваючы ў сваіх пастановах вынаходзтвы і актыўнасьць рабочых, на справе ня здолела змагацца з бюракратычнымі рагаткамі, растаўленымі на шляху разьвіцьця рабочай актыўнасьці.**

У свой час пастанова ЦК і ЦКК КП(б)Б аб зьняцьці апартуністычнага кіраўніцтва Жлобінскага вузла сустрэла аднадушнае ўхваленьне як у партарганізацыі, так і сярод рабочых. У адказ на правільную пастанову ЦК і ЦКК рабочыя чыгункі абвясьцілі вытворчыя манэўры па выкананьні і перавыкананьні трансфіпляну і патрабавалі правесьці датэрміновую чыстку апарату Жлобінскага экспляатацыйнага раёну. Пасьля абвяшчэньня вытворчых манэўраў арганізавалася камсамольская ударная брыгада, 253 рабочыя абвясьцілі сябе ўдарнікамі і г. д.

Вытворчыя манэўры ўзьнялі актыўнасьць рабочых, выклікалі новую хвалю творчага энтузіязму. Вызначыўся пералом у радзе галін работы вузла: значна зьнізіўся процант няспраўных паравозаў, зьменшылася колькасьць наўторнага рамонту і ўзьнялася працаўдзельнасьць працы. Але пералом у рабоце вузла ня быў замацаваны, вытворчыя манэўры не даведзены да канца, у сувязі з чым зноў крывая работы вузла пайшла ўніз. **Партыйныя ячэйкі яшчэ канчаткова не ліквідавалі спадчыны мінулага апартуністычнага кіраўніцтва, ня выкарэнілі апартуністычнай практыкі, не павярнуліся тварам да вытворчасьці, да задач рэканструкцыі транспарту.**

Камісія, якая абсьледавала становішча парт. праф. і гаспадарчай работы на вузле, канстатавала, што рад работнікаў мясцкомаў і парт'ячэек ня здольны стаць на чале змаганьня рабочых-чыгуначнікаў па выкананьні трансфіпляну. Пастановай камісіі рад адказных работнікаў зьняты з работы і заменены выдатнымі рабочымі-ударнікамі.

Ул. Эль.

Міжнароднае і ўнутранае становішча і задачы камсамолу

Даклад Л. М. Кагановіча на IX усесаюзным зьезьдзе камсамолу*)

Новы перыяд сацыялістычнага будаўніцтва ня толькі не зьмяняе гэтых задач разгортваньня масавай работы, узмацненьня ідэйна-палітычнага ўплыву на масы, у дым ліку і на моладзь, але гэтыя задачы ставяцца з яшчэ большай шырынёй і глыбінёй. Рост сацыялістычнага будаўніцтва ня толькі ня зьнімае задачу барацьбы са спробамі дробна-буржуазнага ўплыву, але на пэўны перыяд стаўіць гэту задачу з яшчэ большай вострасьцю. Рост калгасаў патрабуе ўзмацненьня работы па перавыхаваньні ўсёй тэй масы людзей, якая раней жыла ў іншых умовах, якая мае іншыя навыкі, большай часткай навыкі дробнабуржуазныя. І ў калгасе нам таксама прыходзіцца перамагаць яшчэ дробнабуржуазныя ўплывы.

На меншы важна барацьба з дробнабуржуазнымі тэндэнцыямі ў горадзе. У нашых прадпрыемствах зьліваецца вялізарная колькасьць новых людзей. На нашых прадпрыемствах у 1929 г. 25 проц. усіх рабочых былі ва ўзросьце да 22 год. Ва ўзросьце да 30 год налічвалася 50 проц., а па Данбасу—65 проц. Рад заводаў, у прыватнасьці Сталінградзкі і Харкаўскі, камплектуецца амаль выключна за кошт моладзі. Лічба моладзі сярод асоб наёмнае працы дасягае 3,5 млн. У школах ФЗВ у 1929 г. было 163 тыс., у 1930 г.—582 тыс. І ў 1931 г. будзе 1.206 тыс. чалавек. Гэта — вялізарная армія. І задача перавыхаваньня гэтых новых пластоў рабочых, якія прыходзяць з вёскі і гораду, паўстае перад намі ва ўсёй сваёй вострасьці. Мы павінны сваім ідэйным уплывам ахапіць усё больш і больш пыротнія масы. У прыват насьці камсамолу необходна пазбавіцьць ахоп сваім членствам моладзі фабрык і заводаў, фабзавучняў, калгаснікаў. Трэба памятаць, што ідэалёгія капіталістычнае класы, ідэалёгія буржуазіі, вельмі жывучая, яна падфарбоўваецца і прасякае нават у рады такой сталёвай партыі, як наша бальшавіцкая партыя. Таму патрэбна вялікая пільнасьць з боку

Сталін — праваднік сусьветнага камунізму! Ура!»). (Голас: «Няхай жыве прадыр камуністычнай партыі тав. Сталін! Ура!» Бурныя апляўдысмэнты. Воклічы хорам па-украінску: «Слава, слава, слава!). (Апляўдысмэнты). (Голасы: «Рот фронт»). Вызад устае і пляскае дзяцыю тав. Сталіну).

Кіраўніцтва партыі прывяло да максімальнага выкарыстаньня ўсіх магчымасьцяй нашай сацыялістычнай сыстэмы гаспадаркі. Мы разьбілі тэорыю «нагасячай крывой», мы выправілі і ўдакладнілі ніцідоку; мы разьбілі шкодніцкую і зараз сваімі кадрамі іх замяняем і будуем фундамант сацыялістычнай эканомікі; вырасла давер'е рабочых мас да нашай партыі. Кожны рабочы ведае зараз, што партыя і яе Цэнтральны Камітэт цьвёрда вядуць краіну да поўнай перамогі сацыялізму, да таго, каб мы з посьпехам набудавалі сацыялізм у нашай краіне, да таго, каб з посьпехам разьвіваць ход сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Сёньня мы практычна паказалі ўсяму сьвету, што нашы магчымасьці становяцца сапраўднасьцю, што мы ўступілі ў перыяд сацыялізму. Гэта накладвае на нас многа абавязацельстваў, гэта накладвае на нас многа задач на перамаганьні труднасьцяй, якія перад намі стаяць.

Перад намі труднасьці, але перад намі і грандыёзныя перспэктывы.

Мы ведаем, таварышы, што калі сёньня ў нас ёсьць труднасьці забясьпячэньня, то к канцу пяцігодкі кожны рабочы можа быць цьвёрда ўпэўнены, што мы дамо даволі насельніцтву сала, масла, усе патрэбныя прадукты. Рабочы ведае, за што змагаецца. (Апляўдысмэнты). Кожны рабочы ведае, што калі сёньня мы яшчэ не паначалі і не перагнелі буйныя капіталістычныя краіны, то канец пяцігодкі і першыя гады новай пяцігодкі дадуць нам такі гігантскі штурпок, які пакажа ўсяму сьвету, што мы даўжэй той час, калі мы дагонім і перагонім самую перадавую краіну—Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты. Ці давядзем мы да канца пасьпяхова гэту справу, цяжкую справу будаўніцтва сацыялізму, цяжкую справу змаганьня за сусьветны камунізм! Тут мала адной упэўненасьці, мала аднаго тэарэтычнага прагнозу. На гэта адказваюць мільёны, адказваюць масы ўдарнікаў сацыялістычным спаборніцтвам, сваёй арганізаванасьцю, сваёй сілай удару на клясавым ворагу.

Падлічваючы свае сілы на фронце барацьбы з ворагамі як унутры, так і звонку, мы таварым масам: мы цьвёрда ўпэўнены ў сваёй перамозе. Наша армія расьце з кожным днём усё больш і больш. Наша армія — рабочая клясы, калгаснікі, батрацтва, сярэдняцкія масы, якія ідуць за імі, і рэвалюцыйных рабочых ўсяго сьвету.

Нашы арганізаваныя сілы — гэта 11 мільёнаў членаў прафсаюзу, 9 млн. членаў только 2 добраахвотных таварыстваў—Асоавіяхіму і МОПР'у, звыш мільёна дэпутатаў у саветы, якіх мы выбіраем на ўсёй краіне; мільёны ахопленых сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам. 3 млн. камсамольцаў, 4 млн. піянэраў, растучых балёвых будаўнікоў камуністычнага грамадзтва, і ў завяршэньне ўсяго — кіраўнікоў усёй гэтай арміі зьяўляецца арганізаваная, лепшая ў сьвеце пралетарская партыя, якая налічвае каля 2 млн. чалавек у сваіх радох — наша камуністычная партыя бальшавікоў.

Уся гэта армія на чале са сваім ленінскім Цэнтральным Камітэтам дае поўную ўпэўненасьць у тым, што сацыялізм перамога (Апляўдысмэнты).

Таварышы камсамольцы, таварышы піянэры! Вы ішлі за партыяй. Разам з ёю вы атрымліваеце адну перамогу за другой. Ні кроку назад. Уперад за сваю родную бальшавіцкую партыю, за яе Цэнтральны Камітэт, і вы будзеце гаспадарамі ўсяго сьвету! (Бурныя працяглыя апляўдысмэнты. Усе дэлегаты устаюць. Крыкі «Ура». «Інтэрнацыянал». Воклічы: «Няхай жыве ленінскі Цэнтральны камітэт партыі». Крыкі: «Слава, слава»).

*) Канец. Пачатак гл. ў ўчарашнім нумары «Зьвязды».

Камсамол у барацьбе на два фронты

Камсамол у барацьбе за кіраўніцтва, у барацьбе за ідэйную чыстату сваёй лініі паказаў сябе, як я ўжо сказаў у пачатку, вытрымаўшы бальшавіцкі, ленінскай арганізацыяй. Уплывы ў партыі адбіваюць і на камсамоле. Гэта на працягу апошніх год асабліва адчувалася. Зіноўеўская апазыцыя была ў камсамоле. Трацкіцкая апазыцыя была ў камсамоле. Мы мелі і ў камсамоле за гэтыя гады спробы правых ухіляістаў разлагаюча ўплываць на пікатарыя нястойлівыя элементы сярод членаў камсамолу. Барацьба ў партыі з гэтымі ўхіламі згуртоўвала і камсамольцаў, каб змагацца з гэтымі ўхіламі і сярод камсамолу.

Камсамол з такой-жа энэргіяй, з такой-жа сілай паляпіў змагацца з правай небезпекай, як і з трацкіцкай.

У камсамоле больш, тым у партыі былі спробы прышчапленьня «лявацкіх» ухілаў. Гэта зразумела. Моладзь, якая мае менш жыцьцёвага вопыту, мае менш вопыту клясавага змаганьня, — да яе лягчэй падкрадваецца той-жа апартуніст пад «левай» маскай і начынае у яе ўлівацца пэўныя апартуністычныя погляды.

Вы ведаеце, што Троцкі пачаў сваё змаганьне з процістаўленьня камсамолу партыі. Па сутнасьці спрэчкі гэта прабавалі паўтараць Шацкін і яго прыхільнік Ламінадзэ і, праўда, мала маючы агульнага з камсамолам «тэарэтык» Стэн — намесьнік Гегеля на зямлі. (Сьмех).

Дык вось намесьнік Гегеля ў камсамоле Стэн (сьмех) плюс Шацкін і Ламінадзэ — усе гэтыя трое перапішы пасьвесьці камсамол у бой — «Мальбрук у паход сабраўся». Але з гэтага нічога ня выйшла таму, што камсамол паказаў, што ў камсамоле ня месца «лявацкім» спартыўным практыкаваньням. Няхай шукаюць іншых. (Бурныя апляўдысмэнты).

Знайшлі яны сакэзьніка ў асобе Сырцова і разам з ім селі ў вялікую галёшу. (Бурныя апляўдысмэнты). Гэтыя горазнаязыцінеры арганізавалі блёк і надумалі змагацца з партыяй. Але, як вы ведаеце, Марко сказаў, што гісторыя паўтараецца першы раз як трагедыя, а другі раз як фарс. (Сьмех). Камсамол на чале са сваім ЦК у змаганьні з гэтымі спробамі «левакоў» упляхаць, разбурыць яго рады паказаў сябе ў асноўнай сваёй масе як пасьлядоўная, баявая ленінская арганізацыя, якая змагалася за лінію партыі, змагалася за не ПК. (Апляўдысмэнты).

Партыя будзе і надалей весьці рашучае змаганьне на два фронты, і камсамол па-ранейшаму будзе ў перадавых шарэнгах байцоў за лінію партыі.

Партыя атрымала перамогу над усімі апазыцыйнымі групамі: і над трацкістамі, паўтрацкістамі і правымі апартуністамі і прыміранцамі, і над права-«лявацкімі» блёкам і г. д. І тыя, хто цкаваў партыю на працягу раду год, аказаліся простымі москамі, якія брахалі на слона. У гэтых людзей нічога ня вышла, бо жыцьцё іх разьбіла.

Калі мы некалькі год назад павінны былі тэарэтычна даводзіць правільнасьць нашай генэральнай лініі партыі, калі некалькі год назад магло быць якое-небудзь сумненьне ў гэтым, калі мы павінны былі яшчэ даказваць, што такія «паважаныя» людзі, якіх раней вялі, як правадыроў, як Зіноўеў, Каменеў, Рыкаў, Бухарын, што гэтыя людзі супроць партыі, супроць ЦК, то сёньня, таварышы, ужо хоць крыху свядомы пралетары, — ня толькі партыец і камсамолец, — ведае, што калі б гэтыя людзі ўзялі верх, калі б партыя ня выкрыла іх шпіёнага нутра, калі б ЦК з усёй вос трасьцю не пастаяў гэтага пытаньня, мы-б з вамі мелі многа бед, і мы-б з вамі доўгі час потым вымушаны былі карабкацца, каб выбрацца ня толькі па такую пырокую дарогу, як зараз, але каб і адстаяць само існаваньне савецкай улады.

Партыя будзе і надалей весьці змаганьне на два фронты, і камсамол па-ранейшаму будзе ў перадавых шарэнгах байцоў за лінію партыі.

Партыя перамагла, яе лінія перамагла таму, што ЦК цьвёрда і наўхільна стаяў на ленінскім шляху (апляўдысмэнты), і таму, што правадыром нашай партыі зьяўляецца лепшы праваднік ідэй Леніна — тав. Сталін. (Працяжныя апляўдысмэнты). (Воклічы: «Няхай жыве тав.

Ленінізм--сьцяг сусьветнага пралетарыяту*)

ЮГАЎ

Далейшае гістарычнае разьвіцьцё Расіі намячала высоўвала перад рэвалюцыйным і рабочым рухам Расіі пытаньні і задачы, цесна зьвязаныя з міжнародным рабочым рухам. Расія, на чале якое і пасьля рэвалюцыі 1905 г., як і раней, мясьлася феадальная верхавіна Раманавых, якая ўсё яшчэ ня вырашала задач свайго буржуазна-дэмакратычнага руху, усё яшчэ ня скінула манархіі, не ліквідавала феадальна-паменшыцкага зямляўладаньня ня вызваліла прыгнечаных народаў, аказалась ўцягнутай у сыстэму імпэрыялістычных баёкаў. Вымушаныя ўступкі парызму буржуазнаму разьвіцьцю, зробленыя ў выгадзе сталыпінскага аграрнага заканадаўства і сталыпінскай канстытуцыі, спрялі, з аднаго боку, разьвіцьцю капіталізму, спрялі афармленьню ўнутры краіны панаваньня капіталістычнага імпэрыялізму, а другога боку, яшчэ больш абастралі супярэчнасьці паміж капіталістычнымі продукцыйнымі сіламі, якія быстра разьвіваліся, і прыгонніцкай палітычнай абалонкай, рэгулямі прыгонніцтва ў эканоміцы.

Краіна пралетаўляла сабою прыклад выключна складанага перапляценьня супярэчнасьцяй; яна ня скінула яшчэ цяжару буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі а вастрэйшыя супярэчнасьці ўнутры буржуазнага грамадзтва ужо ставілі вострыя праблемы, зьвязаныя з перарастаньнем.

Круты гістарычны паварот, палітычная і грамадзкая рэакцыя ўнесьлі дэмаралізацыю і дэзарганізацыю ў рады партыі. Абодзьве фракцыі: сацыял-дэмакратычная і пралетарская, дробна-буржуазная—раскалоціся на плыні.

У жорсткай барацьбе прыходзілася Леніну ў міжрэвалюцыйны перыяд бараніць сваё разуменьне задач пралетарыяту, сваю канцэпцыю гістарычнага разьвіцьця Расіі свае тэарэтычныя погляды. Леніну прыходзілася ў гэты перыяд ня толькі змагацца на два фронты, але і змагацца часамі з бліжэйшымі былымі аднадумцамі. Леніну прыходзілася змагацца ня толькі з ліквідатарамі і трацкістамі, але і з правымі і левымі прыхільнікамі ўнутры самога бальшавізму — з бальшавікамі - прымірэнцамі і з упрадоўцамі.

Адзін што агульнага магло быць у міжнароднага пралетарыяту з гэтымі фракцыйнымі сваркамі дробных сэкт?—пытаўся сабе гэрой II Інтэрнацыяналу. Добрачынныя фіністэры, якія крыкліва разьмясьціліся ў форштэдзе нямецкай партыі, асноўнай партыі II Інтэрнацыяналу, спачуваньна гіранізавалі такая маленькая партыя і так многа фракцый! Уся гэта барацьба, на іх думцы, калі і магла спыняць прыналам, то толькі прыналам таго, чаго на трэба рабіць.

А між тым у найцяжэйшых умовах Ленін намеціў тактыку барацьбы, якая мае вялізарнае міжнароднае значэньне. Імкнна ў гэты перыяд Ленін у разгорнутай форме павінен быў весьці барацьбу на два фронты. У гэты перыяд ён заказаў тэасэтычных і практычных адносін рэвалюцыйнай пралетарскай партыі да зарымскіцкай і за-запыляманцкай барацьбы, іх судносіны, паказаў необходнасьць злучэньня легальных і нелегальных форм барацьбы, імкнна тады Ленін паказаў значэньне і сэнс «канстытуцыйных канфліктаў» іх адносны да рэвалюцыйных задачэй, мачымае перарастаньне у лёгкіх умовах гнілога парлямэнцкага крызісу ў «хорошенькую», як ён гаварыў, рэвалюцыйную «передрягу», імкнна у гэты перыяд Ленін даў характарыстыку агульнай рэвалюцыйнай абстаноўкі і непасрэдкай рэвалюцыйнай сытуацыі, даў характарыстыку ўмоў, пры якіх узьнікае агульны рэвалюцыйны крызіс.

Леніну ўжо у 1920 годзе прыходзіся ў брашуры аб «Дзіцячай хваробе лявізны» многае паўтарыць з таго, што ён практычна абгрунтаваў і тэарэтычна сфармуляваў у барацьбе з правым і левым апартунізмам яшчэ ў міжрэвалюцыйныя гады.

Што-ж, мела ўсё гэта значэньне для рэвалюцыйнай барацьбы пралетараў, панове дабрачынныя мяшчане з II Інтэрнацыяналу, ці мела?

Вайна, якая, паводле слоў Леніна, зьвязала ўсе дзяржавы ў адзін крывавы камяк, паставіла ўсе праблемы рабочага і рэвалюцыйнага руху ў кожнай паасобнай краіне ў песную і непарыўную сувязь з міжнароднай барацьбой рэвалюцыйных сіл. Нельга адкінуць заданьня, якога Ленін ня зьвязаў-бы і ня стаяў-бы ў залежнасьць з праблемай міжнароднай рэвалюцыі. Але Ленін гэту сувязь і залежнасьць разумеў зусім не мэханістычна. Ленін фармулюе закон аб нярэўнамерным разьвіцьці капіталізму ў яго рэгістасацыі ад эпохі імпэрыялізму і выводзіць цэлер ужо фактычна даказанае жыцьцём палажэньне аб пераможным сацыялістычным будаўніцтве ў адзінай краіне. Гэта на два палажэньні у Леніна аб будаўніцтве сацыялізму ў адной краіне і аб [illegible] васьці ў палітыцы, тактыцы, праграме кожнай краіны выходзіць з міжнароднага пункту гледжаньня з два бакі аднаго і таго-ж палажэньня.

Пачынаючы з часу вайны, пучэньне Леніна [illegible] тэарэтычнае абгрунтаваньне вопыту рускай рэвалюцыі і вопыту барацьбы гераічнага пралетарыяту народаў СССР, але і непасрэдна становіцца, у сапраўдным сэнсе слова, сьцягам і праграмай міжнароднай рэвалюцыі.

Той факт, што у Расіі аказаліся пераплеценымі і зьвязанымі сярэдняя ковае феадальнае зямляўладаньне і пералавы фінансавы капітал, што Расія была вогнішчам усякага роду капіталістычнага, імпэрыялістычнага прыгонніцтва, той факт, што ўсе гэтыя супярэчнасьці аказаліся ў сувязі з вайной цесна зьвязанымі як паміж сабой, так і з асноўнымі супярэчнасьцямі ўсяго імпэрыялізму, той факт, што ўсе гэтыя [illegible] вырашэньне [illegible] ў цяну ўсяго XX веку у [illegible] пыцка захоўвалася рэвалюцыйная сытуацыя,—гэты факт і арабіў Леніна—правадыра і тэарэтыка рускай рэвалюцыі —правадыром і тэарэтыкам міжнароднага пралетарыяту, прымусіў [illegible] і вярнуцца [illegible] ня ўсім [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня [illegible] і ня

Здаровы паравоз — аснова транспартнай гаспадаркі

Узмацніць паравозную гаспадарку

Пасьля XVI партзьезду прайшло ужо больш 6-ці месяцаў. Час выстарчальны для таго, каб заклік тав. СТАЛІНА — «узяцца, нарэшце, пабальшавіцку за справу транспарту і рушыць яго наперад» — быў поўнасьцю ажыцьцёўлен. Між тым, становішча чыгуначнага транспарту ў апошні час такое, што пагроза зрабіць транспарт «вузкім месцам» народнай гаспадаркі ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА.

ВА ЗДАРНЫМ КВАРТАЛЕ МЫ МЕЛІ ПАГОРШАНЬНЕ РАДУ ВАЖНЕЙШЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ АМАЛЬ ПА ЎСІХ ВУЗЛОХ БССР. Нават ПА АРШАНСКІМ І ЖЛОБІНСКІМ ВУЗЛОХ, дзе ў сувязі з вялікімі непаладкамі быў прынят рад арганізацыйных мер, ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯМА НАЛЕЖНАГА ПЕРАЛОМУ.

Адным з найбольш пагражаючых участкаў зьяўляецца ПАРАВОЗНАЯ ГАСПАДАРКА. Паводле статыстычных даных, на адным вузьле БССР процант няспраўных паравозаў НЕ ДАСЯГАЕ НОРМ. Па некаторых вузлох (Гомель, Жлобін) процант няспраўных паравозаў у кастрычніку і лістападзе нават ПАВЯЛІЧЫЎСЯ. Але афіцыяльная статыстыка не адпавядае сапраўднаму становішчу. Фактычна адміністрацыя чыгункі ня ведае колькасьці няспраўных паравозаў, ня ведае сапраўднага стану паравознай гаспадаркі. Аб гэтым даведі ярка сьведчыць значнае павялічэньне колькасьці здарэньняў і выпадкаў псаваньня паравозаў у дарозе.

Паравозная брыгада часамі не зацікаўлена ў наглядзе за паравозам. Сыстэма польдавай язды, выпадковы рамонт—даводзяць паравоз да становішча БЯСПРЫТУЛЬНАГА. Недахват кваліфікаваных машыністаў і памочнікаў прымушае даручаць паравозы людзям, ня зусім добра падрыхтаваным. Гэта таксама ня спрыяе ўзадраўленьню паравозаў.

Выйсьце колькасьць ПАЎТОРНАГА РАМОНТУ сьведчыць аб вельмі кепскіх адносінах да рамонту. Так, па Віцебску ў лістападзе было 96 выпадкаў паўторнага рамонту пры 199 прашыўках, у сьнежні за 25 дзён быў 24 выпадак паўторнага рамонту пры 149 прашыўках. Выпадкі паўторнага рамонту паравоза, які толькі пасьпеў выйсьці за кантрольную будку, называюцца ПА ЎСІХ ВУЗЛОХ. Дагэтуль не нападзе плянавы папярэдні рамонт. Рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва (у маі 1930 г.) не спрыяла адказнасьці за становішча і рамонт паравозаў.

Ва многіх выпадках у дэпо замест адзіначальня ёсьць МНОГАНАЧАЛЬЛЕ або БЕЗНАЧАЛЬЛЕ. У Гомелі быў час, КАЛІ РАБОЧЫЯ НЯ БЕДАЛІ СВАІХ КІРАЎНІКОЎ. У Жлобіне кіраўнік [illegible] раёну падмяняе неспасобных кіраўнікоў работамі ў дэпо.

Становішча чыгуначнага шляху, вагоннай гаспадаркі, сувязі—таксама патрабуе паляпшэньня. АЛЕ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ТРЭБА ЎЗЯЦЦА ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ ПАРАВОЗНАЙ ГАСПАДАРКІ.

Хуткае і карэннае паляпшэньне работы на транспарце немагчыма бяз правільнай перабудовы работы партыйнай, прафэсыянальнай і ўсіх іншых арганізацый. Між тым, праверка кіруючага складу парт. і прафработнікаў важнейшых вузлоў БССР паказала, што парт. і прафарганізацыі яшчэ не перабудавалі сваёй работы так, як гэтага патрабуе ажыцьцёўленьне генэральнай лініі партыі. Пытаньні ўважлівых адносін да паравозаў, паляпшэньня кіраўніцтва паасобнымі галінамі работы, узьняцьця працдысцыпліны, НЕ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЯШЧЭ АСНОЎНЫМІ ВА ЎСЕЙ РАБОЦЕ НІЗАВЫХ ПАРТ. І ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ. Работа гэтых арганізацый яшчэ не перанесена ў низавыя зьвенні — ЗЬМЕНЫ, БРЫГАДЫ, АРЦЕЛІ, ГРУПЫ. Работа яшчэ не прыстасавана да паасобных груп рабочых. НЯМА АПОРЫ ВА ЎСЕЙ ГЭТАЙ РАБОЦЕ НА ЎДАРНІКА. Нават кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам мае шмат недахопаў. Вузлавыя арганізацыі не заўсёды добра ведаюць сваіх ударнікаў, не вяружаюць іх належнай увагай, НЕ ПЕРАНОСЯЦЬ ВОПЫТУ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ У ІНШЫЯ БРЫГАДЫ.

Трэба, каб партарганізацыі неадкладна павярнуліся тварам да вытворчасьці, каб яны падабралі адказных асоб і хутка перабудавалі сваю работу з тым, каб забясьпечыць патрэбны пералом у рабоце транспарту ў бліжэйшы час.

«Партыя ставіць задачы, якія можна выканаць. Можна таксама выканаць задачу паляпшэньня становішча транспарту. ЦК УсеКП(б) аддае вялікую ўвагу пытаньню паляпшэньня работы транспарту. Арганізацыі маю сакал выканаць гэтай задачы, вызначэньнем канкрэтных мерапрыемстваў і перабудовай усёй нашай работы ў гэтым напрамку мы дабіемся выкананьня гэтай задачы ў бліжэйшы тэрмін. «УЗЯЦЦА ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗА СПРАВУ ТРАНСПАРТУ І РУШЫЦЬ ЯГО НАПЕРАД».

За здаровы паравоз

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) прадзявіў транспарту бачныя патрабаваньні—паравозы ў 1931 годзе 330 мільёнаў тон грузу—на 100 мільёнаў тон больш, чым у мінулым годзе, і ў 2 з пад. разы больш, чым у 1913 годзе.

Важнейшым зьвяном у выкананьні плянаў паравозак зьяўляецца паравозны парк. Становішча паравознага парку ў значнай частцы вызначае выкананьне плянаў паравозак чыгуначнага транспарту ў трэцім годзе пяцігодкі. 330 мільёнаў тон грузу можна перавезьці тады, калі кожны паравоз будзе на работе.

У справе аздараўленьня паравознай гаспадаркі рашаючую ролю адыгрывае плянава-папраджальны рамонт. Ад таго, як наладжана лічэньне паравоза, як арганізована прамыўка і як захоўваюцца гарэлкі прастою і якасныя паказальнікі—залежыць у значнай меры бесьперабойнасьць работы паравоза.

Таму ЗМАГАНЬНЕ ЗА ЗДАРОВЫ ПАРАВОЗ ПАВІНЧА СТАЦЬ Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ПАРТЫЙНЫХ, ГАСПАДАРЧЫХ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ТРАНСПАРТУ.

***

Весткі, якія паступаюць з месц, паказваюць, што на транспарце БССР барацьба за здаровы паравоз яшчэ як належыцца не разгарнулася. Многія арганізацыі не павярнуліся яшчэ тварам да паравоза, не мабілізуюць мас на захоўваньне паравоза, на барацьбу з нядбайнасьцю ў адносінах да паравоза, супроць дэзарганізатараў вытворчасьці.

Чамусьці на шэрых [illegible] чыгуначных [illegible], як Аршанскі, пануе безадказнасьць у рамонце паравозаў. Характэрныя факты. Пасажырскі паравоз матутнай сэрыі № 9768, выпушчаны з плянава-папраджальнага рамонту, на першай жа станцыі прымушан быў спыніцца, бо ў ім заказаўся распалёўленым падшыпнік. А ў дэпо Вязьма на паравозе было выкрыта 13 нядобрасумленна адрамантаваных дэталяў, патрабуючых паўторнага рамонту.

Экіпіроўка паравозаў нядобраякасная. Есьць факт фактаў падачы пад цягнікі паравозаў з нескончаным рамонтам, нядбайнага нагляду за становішчам паравозаў у дарозе. Кур'ерскі цягнік № 520 прымушан быў стаяць лішніх 30 хвілін, бо брыгада выехала без вады. У лістападзе на Аршанскім вузьле адзначана 38 выпадкаў нецаўрыхтаванасьці і несвачасовай падачы паравозаў пад цягнікі; у сьнежні—45 выпадкаў. Лішні прастой паравозаў у рамонце дасягае 3-5 дзён. Процант няспраўных паравозаў ня толькі не зьмяншаецца, але ў паасобных месцах нават павялічваецца. Так у кастрычніку, замест прадугледжаных 7,6 проц., было 12 проц. няспраўных паравозаў, у лістападзе—10,1 проц., у сьнежні—10,3 проц. замест 8,5 проц., у студзені процант няспраўных паравозаў дасягае 12.

***

Такія-ж факты есьць ня толькі ў Воршы. У Гомелі за адзін толькі месяц было 179 паўторных рамонтаў. Тут таксама ёсьць тэндэнцыя да росту процанту няспраўных паравозаў. У паравозе «Ф»-13 гомельскага дэпо пры падачы пад цягнік аказалася, што ў ім запсавана труба, не [illegible] вада. Ня выканана [illegible] топка, няма вады ў тэндэры.

У Жлобінскім дэпо замарожан паравоз № 4644. У паравозе № 2109 ад замарожаньня пыхнулі [illegible] ахаладжаньне, а вадзяны каток на выпусьцілі. На вузле ня зьмяшчана ніводнай карэльні шкодніцтва. На ст. Жлобін зпойдзен паравоз, у якім дымагарная труба аказалася забітай бандажнай стружкі.

***

На Менскім вузьле ня выконваюцца вымяральнікі на прабегу таварных паравозаў і наміжлігніковым прастоі.

Барацьба з парушэньнямі працдысцыпліны нядбайнымі адносінамі да вытворчых заданьняў, з дэзарганізатарамі вытворчасьці, прагульшчыкамі і лятунамі не знайшла яшчэ належнага адлюстраваньня ў рабоце партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый. Адзіначальле на месцах ажыцьцяўляецца ня поўнасьцю. Гаспадарнікі часта хаваюцца за сьпіну прафсаюзных арганізацый. Многія саюзныя арганізацыі дрэнна вядуць барацьбу за ўзьняцьце працдысцыпліны, ня ўлічваюць усіх мэтаў барацьбы і тым самым парушаюць дырэктыву ЦК партыі аб паляпшэньні работы транспарту. Увага рабочых мас не мабілізуецца на кожным паасобным выпадку парушэньня працдысцыпліны і здарэньня.

Паказальным у гэтых адносінах зьяўляецца становішча працоўнай дысцыпліны на Гомельскім вузьле. У кастрычніку з боку адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу было 30 выпадкаў нерасправдачасьці, якія выклікалі прастой рабсілы і цягнікоў, у лістападзе—45, у сьнежні—90 выпадкаў. Адмаўленьняў ад работы ў кастрычніку было 6, у лістападзе—8, у сьнежні—18. У кастрычніку зьявілася на работу ў п'яным выглядзе 5 чал., у лістападзе—4, у сьнежні—6. Ня ніводнага агентаў у кастрычніку запісана ў дарозе 14 паравозаў, у лістападзе—12, у сьнежні—14. Другіх відаў парушэньняў працоўнай дысцыпліны было у кастрычніку 116, у лістападзе—149, у сьнежні—148.

***

Ні маёнкомы, ні цэхавая адміністрацыя Гомельскага вузла не займаліся, як належыць, пытаньням працдысцыпліны. Дысцыплінарныя спагнаньні і цырыкоры судоў невыстарчальна выкарыстоўваюцца, як сродкі выхаваньня і папярэджаньня. Адміністрацыя захапляецца репрэсіўнымі мерамі, але вельмі мала робіць для заахвочаньня лепшых рабочых. Так, на працягу аднаго сьнежня накладзена 400 спагнаньняў, у той час, як за ўвесь квартал кастрычнік—сьнежань выдана ўсяго 4 грашовых прэміі. Райпрафсаюз, замест рэшучых мерапрыемстваў па ўзьняцьці працдысцыпліны і кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, абмежаваўся толькі бюракратычнай пастановай, у якой даручае ЦРК распрацаваць мерапрыемствы аб першачарговым забесьпячэньні ўдарнікаў прыладамі і прадуктамі.

На Менскім вузьле за апошні час быў факт замарожваньня і папсаваньня 26-ці пасажырскіх вагонаў, некаторых вадаправодных калёнак, уключэньня ў цягнік няспраўных у антысанітарных адносінах і нават замарожаных вагонаў. За мінулыя пяць дзён было пяць здарэньняў з цягнікамі і паравозамі. Адміністрацыйна-тэхнічнае кіраўніцтва станцыі правяла ў гэтых выпадках бязьдзейнасьць, адсутнічае належная масавая работа сярод рабочых, з боку цэхавых камітэтаў і станцыйнага камітэту.

***

Паравозная гаспадарка і наогул транспарт БССР адчувае востры недахват кадраў. Па-ранейшаму толькі Аршанскім вузьле за 5 год высунута на адказную работу ў савецкія, прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі каля 500 рабочых, у тым ліку кваліфікаваных паравозьнікаў і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў. Пастанова ЦК партыі аб звароце чыгуначнікаў на транспарт дае магчымасьць паскорыць вырашэньне праблемы кадраў.

Па Аршанскім раёне арганізавана 37 розных курсаў, якія падрыхтуюць 1.500 кваліфікаваных работнікаў. 300 пуцейскіх рабочых перакваліфікоўваюцца на стрэлачнікаў. На падрыхтоўку кадраў кожны месяц на вузьле адпускаецца каля 30 тыс. руб. Але гэтыя мерапрыемствы ўсё-ж не здавальняюць патрэбнасьці транспарту і асабліва паравознай гаспадаркі БССР у кадрах. Патрэбны далятковыя меры.

Аб тым, што можна дабіцца аздараўленьня паравознага парку, сьведчыць вопыт работы некаторых вузлоў, якія пры дапамозе сацспаборніцтва і ўдарніцтва давялі процант няспраўных паравозаў да мінімуму.

***

Прэзыдыум Бюро ЦК саюзу чыгуначнікаў на сваім апошнім пасяджэньні прыняў рад важных практычных мерапрыемстваў па аздараўленьні работы Менскага, Аршанскага і Гомельскага вузлоў.

Усе матар'ялы аб нядбайнасьці і безгаспадарчасьці на паказаных вузлох перадаюцца пракурору лінейнага суда БССР для тэрміновага сьледзтва і разгляду.

Адміністрацыйна-тэхнічнае кіраўніцтва стан. Менск, як неадпавядаючае спраўму прызначэньню, зьяўляецца. На працягу двух дэкад павінен быць абноўлен склад цэхкамітэтаў і станцыйнага камітэту. Райпрафсаюз прапанавана прымацаваць ня менш, як на месяц, аднаго члена прэзыдыуму для работы на Менскім вузьле.

На Аршанскім вузьле прапанавана райпрафсаюзу і адміністрацыі выкарыстаць «месячнік трывогі», абвешчаны канфэрэнцыяй ударнікаў для сапраўднага разгортваньня ўдарніцтва і забясьпячэньня ня толькі выкананьня і перавыкананьня вымяральнікаў. Трэба дабіцца таго, каб 1-га і 15-га кожнага месяца праводзіліся зьлёты ўдарнікаў для падагульваньня работы на выкананьні прафпрадпісаньня, праверкі выкананьня ўдарнікамі сваіх абавязкаў і вызначэньня ініцыятыўнікаў. На працягу студзеня павінна быць праверана прадаходнасьць мясцкомаў Аршанскага вузла з тым, каб усіх, хто не жадае быць арганізатарам ударніцтва і змагацца за выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў, замяніць ударнікамі.

Бюро вызначан рад мерапрыемстваў для ўзьняцьця працдысцыпліны на Гомельскім вузьле.

Прафэсыянальныя, партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны бязадкладна разгарнуць шырокую растлумачальную работу ў масах вакол важнейшых пастаноў партыі аб транспарце, за бязадкладную ліквідацыю ганебных парушэньняў працдысцыпліны, за ўзмацненьне кадраў машыністаў і памочнікаў, рамонт паравозаў, за арганізацыю повага ўздыму сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Н.

Ударная брыгада за рамонтам паравозу.

„У нас усё добра, недахопаў няма“

Ня глядзячы на тое, што на Жлобінскім чыгуначным вузьле зьменена кіраўніцтва, рашучага пералому ў рабоце яшчэ няма. Вытворчыя манэўры скончаны. Зьмешчаныя ў шматтыражцы «Ўдарнік» вынікі прасякнуты правым апартунізмам і «очковтирательством». Добрыя бакі асьветлены, хваравітыя абойдзены. Калі-ж рабкоры падалі артыкул аб поздавальняючым выкананьні вымяральнікаў, шматтыражка яго не зьмясьціла.

Загрузка вагонаў за апошнюю дэкаду сьнежня параўнальна з другой дэкадай зменшылася на 25 проц. Вагонаў у рабочым парку больш нормы па 455. Сярэдні сутачны прабег таварных паравозаў складае 124 кілёмэтры замест 203, а сярэдні прабег вагонаў складае 100 кілёмэтраў замест 142.68. **Сустрэчны трансфінплян за час вытворчых манэўраў не прапрацоўваўся і не даведзен да варштату.** Ячэйка КП(б)Б дэпо пры прапрацоўцы сустрэчнага трансфінпляну на 1931 год у лістападзе ўхваліла рэзалюцыю: «Лічыць простой у абточцы 6 дзён, вызначаных дырэкцыяй дарогі, невыстарчальным, які можа быць выканан толькі пры здавальняючым становішчы рабсілы і матар'ялаў». І гэта ў той час, калі абточка ў іншых дэпо робіцца на працягу 13-18 гадзін.

На агульных сходах вылазкі шкоднікаў і розных ухілістаў не заўсёды сустракаюць належны адпор.

Асабліва кепска рыхтуюцца мясцовыя арганізацыі да **чысткі апарату.** На працягу ўсяго часу, амаль месяца, мясцовыя арганізацыі не пасьпелі вывесіць ні аднаго лёзунгу аб чыстцы. Дагэтуль ня скліканы агульнасаюзны сход. За тое, каб змазаць гэта пытаньне, даклад аб чыстцы апарату ўключан у парадак дня сходу, прысьвечанага справаздачы гарсавету. Але і гэты вузлавы сход не адбыўся таму, што рабочыя разышліся пасьля таго, як скончылася кіно. **«Разумнікі» вузла наладзілі кіно перад сходам...**

Партыйная і камсамольская арганізацыі адносяцца да чысткі зусім пасыўна. Адчуваецца сямейнасьць і кругавая парука. На шматлікія сыгналы «Зьвязды», «Рабочага» і іншых газэт аб прарывах на Жлобінскім вузьле ніхто не адгукнуўся. Гэта адбівае ў рабкораў ахвоту пісаць. На сход рабкораў, скліканы 12 студзеня, не зьявіўся ні адзін чалавек. Нават у камісію па чыстцы апарату рабочы ці служачы прыходзіць, азіраючыся на ўсе бакі. Гэта сьведчыць аб **заціску самакрытыкі.**

Артыкулы аб чыстцы апарату зьмяшчаюцца ў шматтыражцы на апошняй старонцы. **Слова «чыстка» ў лёзунгах і загалоўках амаль няма.**

Чыстка апарату наўмысьля затягваецца. Інжынэрна-тэхнічныя работнікі не дапамагаюць рабочым брыгадам. «Не хапае» добраахвотнікаў для ахопу ўсіх груп раёну і станцыі рабочымі брыгадамі.

Характарыстыкі па працаўнікоў раёну даны адміністрацыйны бюракратычныя. Замест таго, каб сказаць, як працаўнік змагаецца за выкананьне дырэктыў партыі і ўлады, яны пішуць: «З працай па займаемай пасадзе спраўляецца, добры выканаўца адміністрацыйных наказаў», у той час калі даная асоба мае 5-6 вымоў. Кіраўнікі груп ня далі ў шматтыражку сваіх справаздач, а той, хто даў, напісаў замест справаздачы пералік абавязкаў. Усё гэта робіцца для таго, каб ня даць рабочым магчымасьці разгарнуць крытыку і самакрытыку такога пытаньня аб чыстцы апарату.

КАМІСІЯ.

Добрае пачынаньне не падтрымана

ЭНТУЗІЯЗМ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ І ЎДАРНІКАЎ ЖЛОБІНСКАГА ВУЗЛА РЭЗКА РАЗЫХОДЗІЦЦА З ЯКАСЬЦЮ КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАСАВАЯ РАБОТАЙ ВУЗЛАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. НА ЗАКЛІК ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У ВЫКАНАНЬНІ ТРАНСФІНПЛЯНУ ПАРАВОЗЬНІКІ АДКАЗАЛІ МАСАВЫМ ПЕРАХОДАМ НА ЯЗДУ Ў ДЗЬВЕ АСОБЫ НА МАГУТНЫХ ПАРАВОЗАХ. З 1 ПА 20 СЬНЕЖНЯ КОЛЬКАСЬЦЬ ГЭТЫХ ДЗЬВЁХ АСОБНЫХ БРЫГАД ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ДА 40, ШТО Ў АДНОСІНАХ ДА ЎСЁЙ КОЛЬКАСЬЦІ БРЫГАД СКЛАДАЕ 42 ПРОЦ. КАБ МЕЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ ВЫКАНАЦЬ УЗЯТЫЯ НА СЯБЕ АБАВЯЗКІ, ПАРАВОЗЬНІКІ ЎНЕСЬЛІ РАД ПРАПАНОЎ, ЯКІЯ БЫЛІ ЗАЦЬВЕРДЖАНЫ НА ВЫТВОРЧЫХ НАРАДАХ.

АЛЕ ГАСПАДАРНІКІ, ЯК ВІДАЦЬ, ПАРАШЫЛІ САРВАЦЬ ГЭТАЕ ДОБРАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ І ВЕЛЬМІ ПАВОЛЬНА ВЫКОНВАЮЦЬ ПРАПАНОВЫ ЎДАРНІКАЎ.

ПАДРЫХТОЎКА ПАРАВОЗАЎ ЭКІПІРОВАЧНЫМІ БРЫГАДАМІ РОБІЦЦА БЕЗ КАНТРОЛЮ І ТАМУ ПАРАВОЗЬНІКАМ ЧАСТА ПРЫХОДЗІЦЦА САМІМ ЗАКАНЧВАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ПАРАВОЗА. АЧЫСТКА ТОПАК НА ПРАМЕЖНЫХ СТАНЦЫЯХ НЕ ЗАЎСЁДЫ РОБІЦЦА СТАНЦЫЙНЫМІ РАБОЧЫМІ. АСАБЛІВА ТАДЫ, КАЛІ НА СТАНЦЫЮ ПРЫХОДЗЯЦЬ АДРАЗУ ДВА ЦЯГНІКІ, ПАРАВОЗЬНІКАМ ПРЫХОДЗІЦЦА САМІМ ЧЫСЬЦІЦЬ ТОПКІ, ШТО ПАЗБАЎЛЯЕ ІХ МАГЧЫМАСЬЦІ АГЛЕДЗЕЦЬ ПАРАВОЗ І ЗМАЗАЦЬ ЯГО. НЯ ВЫКАНАНА ПРАПАНОВА АБ АРГАНІЗАЦЫІ ЗЬМЕННЫХ ПУНКТАЎ. ЕСЬЦЬ ВЫПАДКІ, КАЛІ ПАРАВОЗНЫЯ БРЫГАДЫ ДЗЯЖУРАЦЬ ДА 23-Х ГАДЗІН ЗАМЕСТ 8-МІ. НЕ АБСТАЛЯВАНЫ ПУНКТЫ ДЛЯ АДПАЧЫНКУ ПАРАВОЗЬНІКАЎ. УДАРНЫМ БРЫГАДАМ ПРЫХОДЗІЦЦА ЧАСАМ АДПАЧЫВАЦЬ, ДЗЕ ПРЫДЗЕЦЦА. УДАРНАЯ БРЫГАДА З МАШЫНІСТА ШАПТУНОВА І ІВАШЫНА 24 ЛІСТАПАДА ПРЫЕХАЎШЫ Ў МАГІЛЕЎ, ПРЫМУШАНА БЫЛА СПАЦЬ НА ПАДЛОЗЕ, БО ПАКОР БЫЎ ЗАНЯТЫ ІНШЫМІ ЖЫХАРАМІ. НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА ПРАПАНОВА АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ПАРАВОЗНЫХ БРЫГАД ПАСЬЦЕЛЬНЫМІ ПРЫЛАДАМІ, ГАРАЧЫМІ АБЕДАМІ, НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА ПРАПАНОВА НАКОНТ АБСТАЛЯВАНЬНЯ ПАРАВОЗАЎ ЛІХТАРОМ «АДАМОВІЧА».

НА ЎСЕ НАПАМІНАНЬНІ АДМІНІСТРАЦЫЯ РАЁНУ АДКАЗВАЕ МАЎЧАНЬНЕМ. НЕ ДАПАМАГЛА НАВАТ ПАСТАНОВА РАЙКК. АПОШНІ ТЭРМІН ВЫКАНАНЬНЯ ПРАПАНОЎ БЫЎ 25 СЬНЕЖНЯ ЗРУХУ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯМА.

А. МАШНІЦКІ.

Нярадасныя лічбы

Здаровы на транспарце растуць з кожным месяцам. У лістапе было 67, у жніўні—110, верасьні—102, а ўсяго за квартал—269. Пераважная колькасьць здарэньняў падае на спышеньні цягнікоў у дарозе—123, [illegible] цягнікоў—30, псаваньні паравозаў—32, разрывы цягнікоў на станцыях—22, разрывы цягнікоў у дарозе—11, сутычкі цягнікоў пры манэўрах—9, праезд закрытых семафораў—6, [illegible] на рухомым «составе»—3.

За мінулы чынік было 175 здарэньняў, за лістапад — 195, сьнежань—146, усяго 516. І зноў такі спышеньні перавышаюць — 351, [illegible] цягнікоў—37, псаваньні паравозаў—44, разрывы цягнікоў у дарозе—12, на станцыях—22, сутычкі цягнікоў—9. Калі за сьнежань мы маем зьніжэньне здарэньняў, дык гэта толькі дзякуючы зьмяншэньню руху за гэты месяц.

Даныя за першыя 6 дзён студзеня таксама ня радасныя: спышеньняў—31, псаваньняў паравозаў — 4, крушэньняў—5, недахват вады—2, абрываў—1, усяго—43 выпадкі.

Спышеньні ў дарозе па прычыне зьніжэньня пары і чысткі топак тлумачацца нядобраякаснай шыхтоўкай вагонаў, непрактычнасьцю паравозных брыгад у справе правільнага выдаткаваньня аналу. Характэрна, калі цягнікі суправаджаюць спрактыкаваныя машыністы, спышеньні—вельмі рэдкае зьявішча. Спрактыкаваны машыніст Тамкоў за ўвесь час сацыялістычнага спаборніцтва не дапусьціў ні аднаго спышеньня.

Псаваньні паравозаў сьведчаць аб нядобраякаснай сабоце дэпо. 3-4 студзеня ў Асіповічах сталося 12 паравозаў, якія рамантаваліся ў Жлобінскім дэпо і з прычыны кепскага рамонту труб не маглі забраць цягнікоў. Таму на 7 студзеня ў Асіповічах стварылася «пробка» з 290 вагонаў.

Разрывы цягнікоў залежаць ад нядбайных адносін да работы, паказваюць упад працдысцыпліны.

Упад працдысцыпліны таксама ланцэнэжаецца радам фактаў: паўважлівыя адносіны паравозных брыгад да паравозаў, усюды бруд, паравозы ў дэпо не закрываюцца, часта паравозныя брыгады накідаюць паравозы на ўвесь дзень, не пагасіўшы ліхтароў і г. д.

Наезды на цягнікі паказваюць на нястрымнасьць агентаў да правіл сыгналізацыі.

Вось асноўныя прычыны здарэньняў. Іосаф з узмацненьнем інструктаваньня, падрыхтоўкі кадраў, узьняцьця кваліфікацыі рабочых, узмацненьня барацьбы за працдысцыпліну, узмацненьня палітыка-выхаваўчай работы, трэба прыняць больш жорсткія меры супроць шкоднікаў, п'яніц, рвачоў, якія зрываюць нармальную работу транспарту.

В. МАСЯГІН.

Хаос стаў сыстэмай

ВАГОНЫ І ПАРАВОЗЫ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА НЕРАЦЫЯНАЛЬНА

Гомельскі раён, ня гледзячы на рад сыгналаў друку, ня гледзячы на шматлікія пастановы гаркому партыі, не падае ніякіх прымет палепшаньня сваёй работы.

Кожны дзень гомельскія прадпрыемствы наведваюць начальніка раёну, патрабуючы вагонаў і пляцформ для адпраўкі гатовай прадукцыі. Каля 100 гатовых растворамяшалак заводу «Пралетары» занялі дзьве вуліцы ў цэнтры гораду. Гэтых машын чакаюць нашы буйнейшыя будаўніцтвы, гэтыя машыны ёсьць, але паміж «Пралетарам» і набудовамі знаходзіцца пасярэднік—наш транспарт, які сапраўды зьяўляецца «вузкім месцам». Такое-ж становішча і на Гомсельмашы, які ня зможа магчымасьці адпраўць прадукцыю па месцах яе прызначэньня.

Калі нашым кіраўніком чыгуначнага работу пачынаем паказваць на гэтыя агідныя, яны, не хвалюючыся, адказваюць: «Вось паяўпасьць вагонаў на сёньняшні дзень, вось патрабаваньне на вагоны. Попыт у пекалькі раз перавышае нашыя магчымасьці». Такім чынам увесь гэты хаос тлумачыцца як быццам аб'ектыўнымі прычынамі.

Але вось некалькі фактаў апошніх дзён малюць сапраўдныя прычыны агіднай работы транспарту, факты, якія мяжуюць са шкодніцтвам.

30 сьнежня прыбыло 12 вагонаў з грузам для Белдзяржбуду. Замест таго, каб іх падаць на Земпасад, іх падалі на Гарэлае балота. Там вагоны прастаялі больш сутак і іх прыйшлося забраць перазгружанымі.

На Добрускай станцыі адміністрацыя раптам звольніла 40 грузчыкаў. Ёй здалося, што для іх ня будзе работы. У той-жа дзень прыбыло сем вагонаў пэклы. Вагоны стаялі неразгружанымі пяць дзён. Зусім абураючы факт меў месца на галаваньстве «Д» Зёжкіна і тэхніка Гуляева. Поўны «состав» цягніка з 40 вагонаў быў накіраван для вывазкі сьнегу. Рабочая сіла ня была падрыхтавана і ўвесь цягнік прастаяў больш сутак.

Гэтыя некалькі фактаў, узятыя з цэлай серыі агіднасьцяй, даюць малюнак толькі на пытаньні аб скарыстаньні вагоннага парку.

Есьць яшчэ адно цікавае пытаньне, на якое ніхто не дае вычарпальнага адказу. Ужо каля году, як існуе лінія Беліца—Чарнігаў—Прылукі. Між тым, усе грузы ідуць у напрамку Гомель—Бахмач—Мікалаеў—Чаркасы — Адэса —Хэрсон, г. зн. кругом, у той час, як маршрут праз Чарнігаў па некалькі соцень кілёмэтраў меншы.

Б. Зэльманаў.

14 брыгад—на рамонт трактараў і с.-г. машын

Ня гледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)Б, СНК БССР і Наркамзему аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, рамонт трактараў і с.-г. машын праходзіць гусім нездавальняюча.

Наркамзем, па згодзе з ЦСПСБ, камандыруе ў раёны знаходжаньня майстэрань па капітальным і сярэднім рамонце с.-г. машын 14 брыгад у складзе спэцыяліста-інжынэра або механіка і групы кваліфікаваных рабочых з 3-4 чалавек у кожнай брыгадзе для практычнай дапамогі мясцом у правядзеньні рамонту трактараў і с.-г. машын. Брыгады прабудуць на месцах ня менш месяца. У ліку старэйшых брыгадзіраў вызначаны работнікі Наркамзему, Трактарацэнтру, Белсельснабу, Насэнтрэсту, Сьвіназодтрэсту, машынна-спробнай станцыі, Белкалгасцэнтру і Белсельтрэсту.

Старэйшыя брыгадзіры па прыезьдзе на месцы павінны праверыць становішча майстэрань, сумесна з іх адміністрацыйна-тэхнічным персаналам у 2-хдзённы тэрмін склаць календарны план рамонту з увядзеньнем 2-3-зьменнай работы ў майстэрнях, арганізаваць рамонтную работу ў раёнах, якія прымацаваны да майстэрань.

Выдатак па камандыроўцы кіраўніку брыгад ускладаецца на ўстанову па месцы работы. Аплата пэнсіі камандыруемым рабочым—з разьлікам сярэдняй месячнай зарплаты, сутачныя—у разьмеры 3 руб., выдаткі на пераезьдзе і аплаце кватэрных у разьмеры 2 руб. у суткі (або прадстаўленьне кватэры) ускладаецца на майстэрні па месцы работы брыгад.

Улічваючы на пасеўнай кампаніі СНК БССР—тав. Рачыцкі прапанаваў райвыканкомам аказаць брыгадам максымальную садзейнасьць у выкананьні даручэнай ім работы.

У ленінскія дні

У партыю Леніна. Ударныя брыгады імя Ільліча

— Дзень памяці Леніна прайшоў на ГУЦЕ «ПРАЛЕТАРЫ» (Менск) пад знакам узмацненьня барацьбы на два фронты, за ажыцьцяўленьне пастаноў апошняга пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), за пяцігодку за чатыры гады.

Рабочыя гуты ў гэты дзень дэманстравалі сваю адданасьць генэральнай лініі партыі. 13 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў рады КП(б)Б. Сярод падаўшых — ПАЎЛАЎ, рабочы-ўдарнік з 30-гадовым вытворчым стажам, РУСЕЦКІ—з 20-гадовым вытворчым стажам, КРАСЬНІК—з 20-гадовым стажам, САЛІН,—з 17-гадовым стажам.

РАБОЧЫЯ ПЕРШАЙ ЗЬМЕНЫ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ІМЯ ЛЕНІНА і ўнесьлі 85 рублёў у фонд пабудовы дырыжабля «Клім Варашыпаў».

— Работнікі МЕНСКАЙ ПАШТОВАЙ КАНТОРЫ адзначылі дзень сьмерці Леніна арганізацыйай ударных брыгад імя Леніна і ўступленьнем у партыю. Арганізаваны 4 новыя ўдарныя брыгады. 15 работнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

— 86 рабочых АСІНБУДУ абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя Леніна. 230 рабочых далі абавязацельствы—не пакідаць станцыі да канца пяцігодкі.

— Рабочыя-ТРАНСПАРТНІКІ Гомелю і Рэчыцы арганізавалі 22 студзеня суботнікі па разгрузцы чыгуначнага вузла.

На паўторных рамонтах— Віцебск на першым месцы

Становішча рамонту паравозаў у Віцебскім дэпо гаворыць аб вельмі кепскіх адносінах да паравоза і патрабуе ўвагі ўсіх арганізацый Віцебскага вузла.

Колькасьць паўторных рамонтаў за ўдарным квартале наступнае: у кастрычніку было 157 паўторных рамонтаў, у лістападзе—96 і ў сьнежні—330. Павялічэньне колькасьці паўторнага рамонту ў сьнежні, ня гледзячы на агульнае памяншэньне колькасьці рамантаваных паравозаў (у лістападзе 199, у сьнежні—181), гаворыць аб нядобрасумленых адносінах да рамонту. Толькі па кацельнай брыгадзе колькасьць паўторных рамонтаў зьмен

На шляху сацыялізму

(Да вынікаў 3-яй сэсіі ЦВК СССР 5-га скліканьня*)

Адзіны народна-гаспадарчы плянтвы разьвіцьця прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, перспэктывы матар'яльнага і культурнага ўзроўню найшырэйшых мас працоўных Савецкага Саюзу. Да іх трэба яшча толькі дадаць, што выдатковая частка фінпляну са ўсёй паўнатой адлюстроўвае лінію партыі і савецкае ўлады на ўсямерны гаспадарчы і культурны ўздым прытлечаных пры царызьме нацыянальнасьцяй, на брацкае падтрыманьне працоўнымі усяго Саюзу нацыянальных рэспублік і абласьцей.

Найбольш ярка гэтым момант праяўляецца пры параўнаньні тэмпаў росту рэспубліканскіх бюджэтаў. Так, рэспубліканскі бюджэт РСФСР вырастае ў 1931 г. на 30 проц., УССР—на 32 проц., БССР—на 65 проц., Закаўказьзя—на 50 проц., Узбекскай рэспублікі—на 61 проц., Туркменскай—на 87 проц., Таджыкскай—на 108 проц. Гэта-ж тэндэнцыя адбіваецца і на мясцовых бюджэтах.

Прыняцьце сэсіяй адзінага фінансавога пляну, які канцэнтрує ў руках дзяржавы $^2/_3$ усяго народнага даходу, зьяўляецца вялізарнейшым дасягненьнем Савецкага Саюзу. Але нельга ні на адну хвіліну забываць, што рэалізацыя вызначаных планам паказальнікаў росту фінансавай гаспадаркі патрабуе ад партыйных, камсамольскіх, прафесыянальных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый максімуму намаганьняў, поўнай арганізаванасьці, вялікай арганізацыйнай масавай работы сярод мас працоўнага насельніцтва. **АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ФІНПЛЯНУ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ПРОСТАЙ ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД ТАГО, З ЯКІМ ПОСЬПЕХАМ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ КОЛЬКАСНЫЯ І ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ЎСЯГО ГАСПАДАРЧАГА ПЛЯНУ.** Для прыкладу даволі прывесьці, што адно тольні заданьне аб зьніжэньні сабекошту прамысловай прадукцыі павінна даць краіне каля 3 млрд. руб. Нельга забываць, што ў даходнай частцы фінпляну цэлых 5,7 млрд. руб. складае мабілізацыя сродкаў насельніцтва (з простымі падаткамі). Цэлы рад патрабаваньняў высоўвае перад нашай фінансавай сыстэмай задачу дапасаваньня яе да ўмоў бурнага росту аграмаднага сэктару сельскай гаспадаркі.

Барацьба за жорсткую фінансавую дысцыпліну, за рэжым эканоміі, за выразную клясавую лінію ў фінансавай палітыцы—усё гэта таксама неадлучныя ўмовы выкананьня вернага адзінага фінансавага пляну.

Вакол гэтых задач павінна быць згуртавана ўвага партыі і рабочае клясы, памятаючы, што фінансавы плян трэцяга году пяцігодкі, гэта—«плян далейшай кансалідацыі, выбраньня народных мас вакол саветаў і камуністычнай партыі для выкананьня вялізных задач сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце нашага будаўніцтва».

Бурныя тэмпы разьвіцьця народнай гаспадаркі прывялі Савецкі Саюз да вялізарнейшай перамогі на фронце барацьбы з беспрацоўем. У трэці год пяцігодкі савецкая дзяржава ўступіла ва ўмовах поўнай ліквідацыі беспрацоўя. Перад 3-ай сэсіяй ЦВК Саюзу паўстала задача адшукаць шляхі і вызначыць практычныя мерапрыемствы па вырашэньні праблем рабсьпячэньня сацыялістычнага будаўніцтва рабочай сілай, у асаблівасьці кваліфікаванай. Сэсія заслухала спэцыяльны даклад Наркампрацы і прыняла пастанову, якою абавязала Наркампрацы і гаспадарчыя органы **забясьпечыць прырост на працягу 1931 г. двух млн. чал. новых рабочых і служачых.** Ня менш 700.000 чал. павінна быць уцягнута ў прамысловасьць праз **фабрычна-заводзкія школы** з падростаў—дзяцей рабочых, служачых, саматужнікаў, батракоў, калгаснікаў, беднякоў і серадняком, прычым агульны калтынгент вучэбнай павінен быць даведзен да 1.200.000 чал.

На базах ЦІП'у, згодна пастановы сэсіі, павінна быць ахоплена кароткатэрміновай падрыхтоўкай ня менш 500 тыс. чал.

Нарэшце, 600 тыс. чал. павінны быць **перасунуты на работу больш высокай кваліфікацыі.**

Сэсіяй даны спэцыяльныя ўказаньні Наркампрацы выпрацаваць цэлую сыстэму мерапрыемстваў **па пытаньні ўцягненьня ў вытворчасьць жанчын,** і перабудаваць бытавыя ўмовы жыцьця.

Адным з важнейшых умоў, якія забясьпечваюць вырашэньне праблемы кадраў, зьяўляецца радыяналізацыя скарыстаньня чалавечых рэсурсаў, у прыватнасьці вырашэньня задачы мэханізацыі асабліва працаёмістых вытворчасьцяй народнай гаспадаркі, у сувязі з чым гэта пытаньне ў пастанове па дакладу Наркампрацы выдзелена асобна.

Праблема кадраў у рэканструкцыйны перыяд усклалае на органы працы рад новых сур'ёзьнейшых абавязкаў, патрабуе карэннай перабудовы усёй іх працы ў адпаведнасьці з задачай грабіцца «баявым штабам на вышукваньні і плянавым разьмеркаваньні працоўных рэсурсаў на кіраўніцтве пытаньнямі арганізацыі працы на вытворчасьці».

Выкананьне задач, пастаўленых сэсіяй на 1931 г., будзе ажыцьцяўляцца «ва ўмовах жорсткага супраціўленьня рэштак капіталізму (кулакоў, нэпманаў, шкоднікаў) унутры Савецкага Саюзу, ва умовах ліквідацыі капіталістычнага свету да ўзброенай інтэрвэнцыі».

Ухваліўшы замежную і ўнутраную палітыку ўраду СССР—палітыку няўхільнай барацьбы за мір, барацьбы за бальшавіцкія тэмпы разьвіцьця,—сэсія адначасова паставіла перад урадам і рабочай клясай задачу—**усямерна ўзмацніць абарону пралетарскай дзяржавы,** цьвёрда і рашуча абараняць сацыялістычнае будаўніцтва ад усіх спроб інтэрвэнтаў.

Трэцяя сэсія ЦВК Саюзу зьяўляецца выдатным этапам у гісторыі савецкага будаўніцтва, наваротным моментам у сэнсе перабудовы работы органаў пралетарскай дыктатуры—саветаў—у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду. **Павышэньне ролі саветаў у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, набліжэньне іх да практычных пытаньняў вытворчасьці і калектывізацыі, барацьба за праверку выкананьня—усе гэтыя задачы займаюць важнейшае месцы ў работах сэсіі, чырвонай ніткай яны праходзяць ва ўхваленых пастановах.**

Сэсія прыняла плян гігантскіх работ на будаўніцтве сацыялізму. Асноўная задача зараз—**забясьпечыць ва што-б там ні стала поўнае ажыцьцяўленьне заданьняў, прынятых на 1931 г.** Адзіны народна-гаспадарчы плян павінен зрабіцца сьцягам барацьбы мільёнаў за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі рабочая класа Савецкага Саюзу, вымятаючы са сваёй дарогі ўсе перашкоды, даючы рашучы адпор апартуністам усіх напрамкаў,—забясьпечыць поўнае выкананьне пляну трэцяга году пяцігодкі, даб'ецца завяршэньня набудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, што зьяўляцца «вялізарнейшай сусьветна-гістарычнага значэньня перамогай сацыялізму».

Навіны Аўтадору

Менскае аддзяленьне Аўтадору ўнесла 200 рублёў на набудову 6-цылёндпага аўтамабіля «Аўтадоравец БССР».

Рабочыя сільсарнага цэху заводу «Камунар» унеслі 5 тыс. руб., атрымаўшыя ў якасьці прэміі за добрыя паказальнікі прамфінпляну, на купаю машыны для заводзкай газэты Аўтадору.

Насустрач рабочаму-вынаходцы

Пры навукова-дасьледчым інстытуце прамысловасьці арганізуецца асобны аддзел, які будзе займацца экспэртызай і прапраноўкай найбольш буйных рабочых прапаноў і вынаходстваў.

З 25-га па 30 студзеня праводзіцца краязнаўчая пяціднеўка

САВЕЦКАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

—БАРАЦЬБА ЗА СУСТРЭЧНЫ КОМПЛЕКСНЫ ПЛЯН САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ РАЁНАЎ

Ачысьціць краязнаўчыя арганізацыі ад контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны, варожых элемэнтаў. За новыя, бальшавіцкія кадры краязнаўцаў.

У перыяд разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва на ўсім фронце, асабліва неабходна вывучэньне і ўлік усіх вытворчых сіл краіны, умоў разьвіцьця культуры. Гэта гігантская работа ня можа быць выканана нашымі навукова-дасьледчымі ўстановамі, калі да яе ня будуць прыцягнуты шырокія працоўныя масы. Гэту навуковую работу зараз трэба цесна зьвязаць з краязнаўчым рухам — калектыўным вывучэньнем свайго раёну, заводу, саўгасу, калгасу.

Ва ўмовах БССР краязнаўчая работа ня толькі не дапамагала сацыялістычнаму будаўніцтву, а наадварот краязнаўчыя арганізацыі, як і ўсё БАН, былі засьмечаны варожымі нацдэмаўскімі контр-рэвалюцыйнымі элемэнтамі, вялікадаржаўнымі шавіністамі, якія праводзілі варожую пралетарскай дыктатуры работу. У галіне гісторыі, эканоміі, этнаграфіі, літаратуры, краязнаўства было на службе ў контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму — Лёсікаў, Некрашэвічаў, Смолічаў і К°, такіх махровых вялікадаржаўных шавіністаў, як Доўнар-Запольскі, Кісьлякоў. Брыгады катэдры марксізму і ленінізму, якія працуюць зараз на праверцы прадукцыі інбелкульту і Акадэміі, выкрылі гэту шкодніцкую контр-рэвалюцыйную работу і ў галіне краязнаўства. Аднак, гэтыя ўрокі, пра якіх ня раз пісалася ў друку, ня ўсімі, каму трэба, з належнай бальшавіцкай пільнасьцю ўлічаны. Нават на сёньня на цэлым радзе раёнаў мы маем безадказнейшыя адносіны да краязнаўчай работы.

Мы маем такія факты, калі старшынёй раённага бюро краязнаўства зьяўляецца асоба, пазбаўленая выбарчых правоў (Асьвея), калі контр-рэвалюцыянэр юрыдычна і на сёньня зьяўляецца старшынёй таварыства (Пічэта ў БДУ), калі замест мабілізацыі мас на ліквідацыю прарываў паведамляюць, што «ніякіх краязнаўчых арганізацый у раёне няма» (Сьмілавічы). Усё гэта з асаблівай вострасьцю ставіць перад партыйнымі арганізацыямі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю БССР пытаньне аб безадкладнай і карэннай перабудове краязнаўчай працы ва ўсіх яе зьвяньнях і галінах, аб поўным не падпарадкаваньні інтарэсам дыктатуры пралетарыяту.

ЦК КП(б)Б даў дырэктыву аб правядзеньні краязнаўчай пяціднеўкі з 25 па 30 студзеня г. г., як масавай кампаніі за савецкае краязнаўства, якая павінна мабілізаваць шырокія працоўныя масы на навукова-дасьледную працу для хутчэйшага выкананьня і перавыкананьня нашых пляноў ва ўсіх галінах сацыялістычнай эканомікі і культуры.

Краязнаўства пяціднеўка павінна **прайсьці пад лёзунгам рашучага выкрыцьця контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і выгнаньня з краязнаўчых арганізацый усіх нацдэмаў і ўсяго элемэнта, перашкаджаючага сацыялістычнаму будаўніцтву.** Краязнаўчая пяціднеўка павінна прайсьці пад лёзунгам **мабілізацыі рабочых і калгасных мас на разгортваньне савецкага краязнаўства.**

У часе краязнаўчай пяціднеўкі трэба правесьці масавыя раённыя (гарадзкія) сходы з шырокім удзелам рабочых, калгаснікаў і афіцыёзных раённых бюро, умацаваўшых іх клясавымі вытрымванымі таварышамі. **Краязнаўчая пяціднеўка павінна папажыць пачатак масаваму разгортваньню краязнаўчых гурткоў на фабрыках, заводах, у калгасах, саўгасах, навучальных установах.**

Краязнаўчая пяціднеўка ня можа прайсьці міма нашых музэяў, якія ў абсалютнай большасьці зусім чужыя нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, а некаторыя з іх да апошняга часу праводзяць шкодніцкую працу (Віцебскі музэй).

Краязнаўчая пяціднеўка павінна ўскалыхнуць усю пралетарскую грамадзкасьць на **карэнную перабудову музэяў, каб іх ператварыць у антыўных агітатараў і прапагандыстаў сацыялістычнага будаўніцтва.**

Нытаньне музэйных кадраў з такой жа адказнасьцю павінна быць вырашана, як і падбор кіруючых краязнаўчых кадраў, «не палохаючыся таго, што гэта пытаньне навуковае, што гэта пытаньне літаратуры, што гэта пытаньне мовазнаўства і г. д., партыі прыдзецца кіраваць» (тав. Гей, аб выніках Кастрычніцкага пленуму). Віцебскі аддзел нарасьветы, выходзячы з установкі партыі, паслаў загадчыка музэю камуніста тав. Шчуцкага, які ўжо за кароткі час, пры сабатажы з боку музэйных работнікаў, арганізаваў выстаўку рэвалюцыі 1905 г., а замест іспаўнага царкоўнага музэю —антырэлігійны музэй. Гэтыя невялічкія крокі барацьбы за савецкі музэй ужо зьмянілі як твар наведвальнікаў, так і колькасьць іх. Зараз музэй пачалі наведваць рабочыя арганізацыі, калгаснікі, школы і за два месяцы музэй наведала каля 10 тысяч чалавек.

Пры разгортваньні краязнаўчай пяціднеўкі неабходна зараз-жа ўключыць краязнаўчыя арганізацыі ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства. Гэту работу трэба шырока зьвязаць з конкурсам на лепшае вывучэньне фабрык, заводаў, саўгасаў, які будзе абвешчаны ВСНГ, Калгасцэнтрам і Цэнтральным бюро краязнаўства ў бліжэйшы час.

Пляны і тэмпы краязнаўчай працы павінны выходзіць з дырэктывы партыі, з тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, з аспэктаў лёзунгу: «Пяцігодка—за чатыры гады». **«Калі сустрэчныя пляны фабрык, калгасаў асобных арганізацый зьяўляюцца плянамі галінавымі, то краязнаўчыя пляны павінны зьяўляцца комплексным сустрэчным плянамі па ўсіх галінах гаспадаркі, культуры і быту данага раёну. Такім чынам, на даным этапе разгортваньня сацыялістычнага наступленьня савецкае краязнаўства ператвараецца ў барацьбу мас за сустрэчны комплексны плян сацыялістычнай рэканструкцыі раёнаў»** (з палажэньня таварыства марксыстаў - краязнаўцаў пры Камавадэмі).

Пры правядзеньні краязнаўчай пяціднеўкі трэба разгарнуць масавыя формы агітацыі і прапаганды, шырокую кампанію ў цэнтральным і мясцовым друку, пасьцецгазетах, даклады, дыспуты, масавыя экскурсіі на фабрыкі, заводы, калгасы, саўгасы; масавыя сходы краязнаўчых арганізацый, карнавалы моладзі, прысьвечаныя характарыстыцы раёну, гораду і яго сацыялістычнаму будаўніцтву; арганізацыя выставак кніг і газэт, якія характарызуюць наш рост і наша будаўніцтва і г. д.

На дапамогу раённым штабам па правядзеньні краязнаўчай пяціднеўкі павінны прыйсьці ўсе раённыя арганізацыі і ўстановы.

Бальшавіцкае кіраўніцтва краязнаўчай пяціднеўкі забясьпечыць начатковае мас на навукова-дасьледную працу, бальшавіцкае правядзеньне краязнаўчай пяціднеўкі забясьпечыць начатковае вынарчоўваньне контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны ў краязнаўстве і ператворыць яго ў сапраўды савецкае краязнаўства — барацьбіта за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

В. СЕРАФІМАЎ.

На раённых зьездах саветаў

Пад лёзунгам сацыялістычнай перабудовы вёскі

ЛОЕЎ. (Наш кар.). Трэці раённы зьезд саветаў прадзіньдзе пры шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыцы работы РВК.

Як у дакладах, так і ў спрэчках ва ўсю шырыню пастаўлена пытаньне аб перабудове работы сельсаветаў і РВК у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду.

На працягу першых двух дзён калгасы Лоеўшчыны дэманстравалі перад зьездам свае дасягненьні. У рапартах зьезду дэлегаты калгасаў заявілі, што **яны будуць няўхільна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і ўраду ў галіне калгаснага будаўніцтва, што на аснове суцільнай калектывізацыі будзе ліквідавана як кляса кулацтва—апошняя апора капіталістычнага ладу.**

У падарунак зьезду калгасы імя Сталіна, Молатава, «Чырвоны востраў» арганізавалі чырвоныя абозы са збожжам.

Старшыня калгасу «Чырвоны партызан»—«25-тысячнік» Марозаў, які на працягу кароткага часу дабіўся пашырэньня калгасу з 17 да 70 гаспадарак, абвясьціў сябе ўдарнікам імя трэцяга году пяцігодкі і закантрактаваўся на рабоце ў калгасе да канца пяцігодкі.

Старшыня Карпаўскага савету, рабочы—«25-тысячнік» т. Раманькоў таксама абвясьціў сябе ўдарнікам і выклікаў на сацспаборніцтва рад іншых старшынь сельсаветаў.

Сустрэчны плян веснавой сяўбы

БЯРЭЗІНА. (Наш кар.). Скончыўся раённы зьезд саветаў. Справаздачу аб дзейнасьці ЦВК БССР рабіў т. Пятровіч.

У гонар зьезду працоўныя мястэчка нападзілі дэманстрацыю, якая прайшла пад знакам адданасьці генэральнай лініі партыі і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Раённы зьезд саветаў высунуў свой сустрэчны пашыраны плян правядзеньня веснавой сяўбы.

Зьезд выбраў новы райвыканком з 30 членаў і 10 кандыдатаў, у які ўвайшлі калгаснікі і беднякі-адзіначособнікі. Адналасна выбран старшынёй РВК т. **ЧАРНЯК.**

Ж-І.

Зьезд абвясьціў сябе ўдарным

РАСНА. (Наш кар.). 6-ты раённы зьезд саветаў Расьняншчыны абвясьціў сябе ўдарным па выкананьні кантрольных лічбаў трэцяга году пяцігодкі, у тэлеграме на імя ЦК КП(б)Б зьезд запэўнівае партыю, што ён далкам выканае задачы трэцяга рашаючага году.

Бабруйскі гарсавет выпусьціў апартуністычную, палітычна-шкодную справаздачу

БАБРУЙСК. (Наш кар.). На справаздачна-перавыбарчых сходах у РВК і на ст. Бярэзіна дакладчыкі ад гарсавету т. т. Дымнікаў і Левін, адказваючы на выступленьні таварышоў, якія крытыкавалі работу гарсавету, заявілі: «паколькі вы абмежавалі тэрмін для дакладу, я ня змог пры ўсім маім жаданьні падрабязна спыніцца на пытаньнях: клясавай барацьбы, апартунізму ў рабоце гарсавету і савецкіх устаноў, пытаньнях нацыянальнага выхаваньня і барацьбы з шавінізмам, кіраўніцтва гарсаветам калгасамі, дапамогі калгасам пры ўборцы ўраджаю, становішча прамысловасьці ў галіне выкананьня прамфінпляну, ударніцтва і сацспаборніцтва, крытыкі і самакрытыкі і ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны».

Аб чым-жа гаварылі дакладчыкі, калі з іх справаздач «выпалі» самыя важныя пытаньні? Дакладчыкі гарсавету занялися лічбовымі выкладкамі, награмаджэньнем розных табліц і дыяграм, зусім забыўшы пра вузлавыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва.

Апартуністычныя выступленьні Дымнікава і Левіна не выпадковыя. Прачытаўшы ўсе 53 старонкі друкаванай справаздачы Бабруйскага гарсавету, вы ня знойдзеце ні аднога радка, дзе-б быў дан адказ на вышэй пералічаныя пытаньні. Хіба тут таксама «абмяжован тэрмін»?

Трэба скасаваць тыя справаздачна-перавыбарчыя сходы, дзе зроблены апартуністычныя справаздачы, дзе змазаны важнейшыя задачы барацьбы за генэральную лінію партыі.

Паведамленьні

ЗАЎТРА:

— Культпроп ЦК КП(б)Б 26-1 31 г., у 18 гадз. сьлінае нараду па пытаньні правядзеньня дэкады штурму на ліквідацыі прарываў у галіне ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі нянісьменнасьці. Неабходна зьявіцца наступным т. т.: НКА—Платуш, Ерафеў, Дашкевіч і Сьцепанюк, Белкалгасаюз—Гінзбург і Туркевіч, Белкалгаспэнтр—Кірнос, Наркамзем—Шушкевіч, Самнрамсаюз—Эфрон, Дзяржплян—Мацьяс, загадчыкам культмасавых сэктараў усіх ЦП саюзаў, загадчыкам культ-масав. адд. усіх цэнтральных газэт, кіраўнікам культ-масав. працы: Белдзяржкіно, ВСНГБ, Камітэт па справах друку, БДВ і Белжылсаюз.

— Дом Намасьветы. У 19 з пал. гадз. —партыйна-камсамольскі актыў. Даклад т. Міцькова «Становішча калектывізацыі на БССР, задачы веснавой сяўбы і чэрвоныя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі (па выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б». Пасьля сходу—канцэрт калектыву гарнапэтэў.

У 19 гадз.—групавая кансультацыя для прапагандыстаў вайсковых начатковых школ—«Індустрыялізацыя—асноўны загар сацбудаўніцтва».

У 10 гадз. ран. (пак. № 24)—заняткі семінара рабочых прапагандыстаў сеткі партасьветы. Яўка абавязкова паступным т. т.: Ханіна, Талстой, Шчупак, Гурвіч, Радзіцкі, Шыф, Шалюк, Бухціяў.

— Камвуз. У 19-ай гадз. у памяшканьні ленінскага габінету Камвузу (Універсытэцкая, 27) абгудзецца пасяджэньне Т-ва Гісторыкаў-марксыстаў.

У парадку дня—прадпяг спрачак па дакладу т. **Дуднова** аб ідэалёгічным перыядзе.

Прысутнасьць членаў т-ва і зацікаўленых абавязкова. Запрашаюцца таксама партыйны актыў і выкладчыкі гісторыі.

— ЦСПСБ. У 12 гадз. у памяшканьні Культсэктару ЦСПСБ (Дом Працы, 2-й паверх) абгудзецца нарада загадчыкаў культсэктараў ЦП саюзаў, загадчыкаў клюбаў і прафсаюзн. бібліятэкараў па пытаньні аб адзінай бібліятэчнай сэтцы.

— Навук. Асацыяцыя. У 20 з пал. гадз., у памяшк. катэдры фармакалёгіі абгудзецца пасяджэньне фарман. сэктару навуковай асацыяцыі МСП.

— Фізмат асацыяцыя. Сёньня, 26 студзеня, у 17 гадз., у фізычнай аўдыторыі БДУ—даклад дацэнта Шаланурава «Фізыка ў паштавічнай школе». Уваход вольны.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-36	Начны рэдактар	9-42
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-51
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-21
		Аддзел абвестак	7-61

Умовы падпіскі:
(з дарожным дадаткам „Прафрук")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі.
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншая гарадзкая абвестка—8 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры пагадзовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. 50 проц. 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬЯЗДЫ" Менск, Савецкая, 2-й паверх тэл. 7-81. 63

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 25 студзеня—для інвалідаў
„ПЕРШАЯ КОННАЯ"
Пачатак у 9 гадз. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Новая гукавая праграма
ПЛЯН ВЯЛІКІХ РАБОТ (пяцігодка)
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
1) 1905 год у буржуазнай сатыры
2) Часопіс № 4-5 Белдзяржкіно
Пачатак 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
НОВЫ ФІЛЬМ ПР. 1905 ГОД
ЖАЛЕЗНЫ АВАНГАРД
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Кіно-хроніка „СОЮЗКІНО" № 70
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м., 10 г. 20 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Культурфільм вытворчасьці «СОЮЗКІНО»
ЗЬВЯНО ЭНЭРГЕТЫКІ
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Культур-фэльетон
НАСТУПЛЕНЬНЕ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Прыгавор пралетарыяту „прамаўры"
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Два фільмы ў адзін сэанс
1) Патаўленьне У. І. Леніна хроніка ў 3-х частках.
2) Камуна Батракоў у 3-х частках.
Пачатак сэансу ў 1 гадз. дня.
Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „Партак"
ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ у 5-ці частках.
Зьвыш праграмы Кіно-хроніка 125-годзьдзе Н. зьезда універсытэту у 1 частцы.
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадзін.

Праўленьне арцелі швэйнікаў „ПРАЛЕТАРЫ"
нагадваю ўсіх грамадзян, што заказы адзяленьне арцелі «Новы Шлях» перайшло ў веданьне арцелі «Пралетары» і папоўнена майстрамі высокай кваліфікацыі
Прыём заказаў на цьвёрдых расцэнках на новую мужчынскую, жаночую і вайсковую вопратку, а таксама жаночыя сукенкі з матар'ялу заказчыка і розныя лішкі і пераробкі, адкрываецца з 21-га студзеня.
Прыклады, кн-та: футравыя кажухі, падшэўку і інш. дае арцель.
Прыём—штодзенна апрача выхадных дня з 9-12 і з 1-4 дня на мужчынскую, вайсковую вопратку і жаночыя верхнія сукенкі на Ленінскай, 16.
На жаночыя сукенкі—па Савецкай, 83.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ЗАЎТРА 26 студзеня
РУБІКОН
ЗАЎТРА 26 студзеня

Чужаземныя маракі будуць абараняць пяцігодку

Ленінград, 10. Сход маракоў Англіі, Амэрыкі, Нямеччыны, Даніі, Швэцыі, Латвіі, Нарвэгіі, Югаславіі і Савецкага Саюзу, які адбыўся напярэдадні 3-га году пяцігодкі ў залі саюзаў ленінградскага палацу Працы, прагледзеўшы рэвалюцыйны кінофільм «Рубікон», пастанавіў зьвярнуцца ў Прафінтэрн і Чырвоны Інтэрнацыянал маракоў з наступнай тэлеграмай:

«Мы, маракі, запаўняем Прафінтэрн і Чырвоны Інтэрнацыянал маракоў, што падобна гэрою карціны мараку Білю мы ўсе, як адзін, будзем абараняць пяцігодку — фундамант сацыялістычнага будаўніцтва, якое вымуляецца магутным вагаром сусьветнай рэвалюцыі».

(Газ. „ПРУД" № 12(3010) ад 12-I 1931 г.).

ПОЛАЦКІ СЕЛЬСКА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае
што ПРЫЁМ 60-ці асоб на першы курс ПРАЦЯГНУТ
да 10-га лютага 1931 г.
Заявы і дакумэнты можна дасылаць, згодна раней надрукаваных умоў прыёму (гл. «Зьвязды» ад 11 і 12 студзеня г. г., «Савецкую Беларусь» ад 13-I і «Чырвон. Полаччыну» ад 15-га студзеня).
Дырэктар тэхнікуму АЗІОРСКІ.

Праектна-канструктарскае бюро БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
—) па сьветакапіяваньні (—
ЧАРЦЯЖОЎ
НА СВАЁЙ ПАПЕРЫ.
З арганізацыямі, якія здаюць буйныя заказы на капіяваньні, заключаюцца ўмовы. Работы выконваюцца ПА ЗНІЖАНАЙ ЦАНЫ.
Адрас: Рэвалюцыйная, 8, тэлеф. 10-40.
Праектбюро Будаб'яднаньня.

НОВАЯ КНІГА
АГУЛЬНА ДАСТУПНЫ СТОЛ
„НАША КУХНЯ"
Сакалі Панятоўскага і Рэйрасава 538 рэцэптаў розных страў прыстосоўна да сучасных умоў. Ц. 2 руб. 40 к. з дарас. Высылаецца наш. плацёж. без задатку.
„Масква, 10 Доміньёўскі, 30,
„МОСТОРГИН".

Для дакладаў НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ Г. МЕНСКУ ў часе правядзеньня
„КРАЯЗНАЎЧАЙ ПЯЦІДНЕЎКІ"
(25-30 студзеня) прымаюцца наступныя таварышы:
Сабалеўскі і Сяпёнава («Энергія»), Садоўскі («Камунар»), Зусьвоў («Полымя рэвалюцыі»), Розін—ВСНГ («Ударнік»), Гершэнзум («Эльвод»), Левантчук (абутковая фабрыка), Мацюкевіч Я. (шчотачная фабрыка), Воранава (пчаўная фабрыка), Туравец («Усход»), Сьцепанюк—НКА («Бальшавік»), Данісюк («ДО»), Фрыд (фабрыка «Беларуская»), Кац Г. («Кастрычнік»), Бабіцкі («1 мая»), Лучыцкі («8 сакавіка»), Яноль («імя Крупскай»), Галубок («Пралетары»), Аворка (хэмфарм. зав.), Малайка («Чырвоная зорка»), Кобэр («Камунарка»), Калёў (хлебазавод), Барашка (друкарня імя Сталіна), Шаўрэзе (Калгасаюз), Фітлоўская, Пратасевіч, Дворкіна, Фрыд, Рохлін, Левін (прыгарадныя калгасы і саўгасы), Рубіна (яўр. пэдтэхнікум), Зарэмбскі (польпэдтэхнікум), Рудавіч (гарком ЛКСМБ), Падбярэзны (АБВШ і 38 полк).
Усе даведкі, указаньні і матар'ял для дакладаў можна атрымаць у Цэнтральным Бюро Краязнаўства (БАН, пакой 22). Да 5 лютага ўсім дакладчыкам трэба даць весткі ў ЦБК аб выніках правядзеньня пяціднеўкі на прадпрыемствах, да якіх прымацаваны дакладчыкі.

Менскае кіраўніцтва надраў прапануе ўсім прадпрыемствам і ўстановам гор. Менску
ПАДАЦЬ ПЛЯНЫ
патрэбнасьці і пакрыцьця рабсілы 1931 г. да 1-га лютага г. г.
прычым весткі павінны прысылацца незалежна ад таго патрэбуецца ў гэтым годзе дадатковая рабсіла ці не. Пляны павінны быць складзены па формах, згодна пастановы Наркампрацы, абвешчанай у газэце «Савецкая Беларусь» ад 9-1 г. г., з наступнымі зьменамі па форме № 1:
Графа 36—37 трэба лічыць сезонку рабочых і служачых.
Графа 38—39 батракі
„ 40—41 беднякі і калгаснікі
„ 42—43 іншыя, якія маюць права на рэгістрацыю біржы працы.
Форма № 3.
Графа 12 трэба лічыць батракоў
„ 13 „ „ сем'яў рабочых і служачых і іншых, якія маюць права на рэгістрацыю.
У плянах паказваецца тэрмін тых рабсіл, якая будзе зьнята (або зараз зьнята) на працы ў межах г. Менску. За непадачу пляну да тэрміну або не па форме будзе накладзен штраф на кіраўнічоў прадпрыемстваў і ўстаноў асобіста.
Нам. заг. кіраўніцтва надраў г. Менску Юшко.

Бабруйскаму лесатэхнічнаму тэхніку патрэбны МІКРАСКОПЫ.
Жадаючым прадаць зварачацца на адрас: Бабруйск, Савецкая, 75, тэл. № 144.

ЗГУБЛЕНА КРУГЛАЯ МАСТЫЧНАЯ ПЯЧАТКА
ліквідаванага Магілеўскага Акруговага саюзу Паляводн. і сельска-гаспадарчых калектываў.
ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ.

ВЫШЛА з ДРУКУ,
прадаецца ў кнігарнях і рассылаецца падпісчыкам
„УЗВЫШША"
№ 9-10
ЗЬМЕСТ НУМАРУ:
М. Лужанін.—Дзень гневу.
У. Хадыка.—Над дрэнжвай чарадою.
В. Казлоўскі.—Абяшчаю я сваё прыгавор.
З. Бядуля.—Таварыш Мінін.
А. Ушакоў.—Зарава затранак.
П. Ананьеў.—Начная вьюга.
Б. Лугоўскі.—Шасьцярэнка.
Кузьма Чорны.—Ідзі, Ідзі (раман).
Крапіва.—Хвалос—чырвоны вос (казка).
В. Сташэўскі.—Гарачы віхор (п'еса)
А. Пруднікаў.—На Дняпры.
З. Віталін.—Будоўля.
В. Зябко.—Нататкі пра творчасьць А. Аляксандровіча.
Ад. Цітоў.—«Пролітфронт».
Падпіска прымаецца ў аддзеле падпісных і перыядычных выданьняў (МЕНСК, Савецкая, 79), у цэнтральнай кнігарні (рог Савецкай і Ленінскай), на пошце, спажывецкай кааперацыі.

УКРАДЗЕНА круглая пячатка рабочкома саўгасу «Рачкавічы, Чырвона-Слабодскага раёну.
Лічыць несапраўднай.

АБВЕСТКІ
— 1 —
ПАВЕДАМЛЕНЬНЯ у чэрвоным нумэры „ЗЬЯЗДЫ"
прымаюцца толькі да 2-х гадз. дня.

Кошт публікацыі 1 р. за куб. 1 дакумэнту

Менск, друкарня «ЗЬЯЗДЫ».
Менск. Галоўлітбел № 337.